15—22-XI—„ДЭКАДА АБАРОНЫ“

„БУДЗЬЦЕ НАПАГАТОВЕ,
беражзце абароназдольнасьць нашай краіны і нашай Чырвонай арміі, як зяніцу вока“ (ЛЕНІН)

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XIV
№ 266 (3864)
СУБОТА, 15 лістапада
1930 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзённа за выключэньнем нядзьвяргоў

„Буржуазія ўзбройваецца, зразумела, не для пустых забаў, яна ўзбройваецца апрача ўсяго іншага і для таго, каб змагацца з надыходзячай рэвалюцыяй і ў першую чаргу, каб паспрабаваць сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва. Ведаючы аб гэтым, мы ня маем права забываць ні на адну хвіліну аб абароне краіны“ (ВАРАШЫЛАЎ).

„Міжнародны капіталізм паломіць свае зубы аб сталёвую цьвярдыню краіны, якая будуе сацыялізм“

Гутарка са старшыней СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДАМ

Пралетарыят Савецкага Саюзу з посьпехам разьвівае сацыялістычнае будаўніцтва па ўсім фронце. Пад выпрабаваным кіраўніцтвам партыі і яе ЦК мы ідзем гіганцкімі крокамі наперад, ператвараючы СССР у краіну індустрыяльную, у краіну суцэльнай калектывізацыі. Мы ўжо ўступілі ў перыяд сацыялізму.

Жорсткім клясавым змаганьнем, супраціўленьнем клясавага ворага, шкодніцтвам, наскокамі на генэральную лінію партыі з боку правых і «левых» апартуністых, з боку двурушнікаў — суправаджаецца наш шлях да 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Расьце актыўнасьць антысавецкіх элемэнтаў за граніцай. Міжнародная буржуазія з усіх сіл стараецца скалаціць агульны капіталістычны блёк, рыхтуючы новы ўзброены напад на краіну дыктатуры пралетарыяту.

Зараз, як ніколі, мы павінны быць гатовы да абароны.

Зараз, як ніколі, павінна быць гатова наша Чырвоная армія.

Чырвоная армія — надзейны вартаўнік савецкіх межаў. Клясавая згуртаванасьць яе радоў, ідэёвае адзінства, цьвёрдасьць і вытрыманасьць партарганізацыі, умацаваньне дысцыпліны, сувязь з працоўнымі масамі, — робяць Чырвоную армію вярнейшым аплотам абароны межаў Савецкага Саюзу.

Чырвоная армія гатова да бою за заваяваньні Кастрычніка.

Генэральная лінія сац. будаўніцтва яшчэ больш умацоўвае Чырвоную армію. Рост нашае гаспадаркі па сацыялістычным шляху, разьвіцьцё нашае прамысловасьці дазволілі ўжо зараз у адносінах баявых сродкаў і ўзбраеньня узьняць Чырвоную армію на ўзровень пярвейшых армій ва ўсім сьвеце.

Посьпехі прамысловасьці, разьвіцьцё аўтатрактарабудаўніцтва, авіяцыйнае прамысловасьці стварылі новыя прадпасылкі для тэхнічнага росту Чырвонай арміі.

Чырвоная армія расьце і разьвіваецца ў нагу з нашай савецкай сацыялістычнай краінай. Нашы посьпехі на фронце індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскае гаспадаркі непасрэдна вядуць да далейшага ўмацаваньня баявой магутнасьці РСЧА. Сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі ўжо адыгрывае вялізарнейшую ролю ў справе ўмацаваньня абароны. Рабочая кляса СССР складае аплот — асноўны грунт складу Чырвонай арміі. Таксама ў калгасах і саўгасах на аснове новых вытворчых адносін, калектыўнага згуртаваньня нараджаецца новы тып чырвоناармейца.

Вось чаму адной з сурёзьнейшых задач надыходзячай «дэкады абароны» зьяўляецца мабілізацыя рабочае кляасы і працоўных мас на выкананьне задач індустрыялізацыі краіны і правядзеньне калектывізацыі, як асновы ўмацаваньня абароناздольнасьці СССР.

XVI зьезд УсеКП(б) паказаў на неабходнасьць далейшага ўсямернага ўмацаваньня баявой магутнасьці РСЧА. Узмацненьне ўвагі і сувязі працоўных з Чырвонай арміяй, найшырэйшая дапамога часьцям РСЧА, значны зрух у рабоце Асоавіяхіму — усё гэта сьведчыць, што пастановы зьезду ўжо пачалі ажыцьцяўляцца.

«Дэкада абароны» павінна паслужыць сродкам самай шырокай прапаганды пастаноў XVI зьезду па пытаньнях абароناздольнасьці краіны, умацаваньня баявой гатоўнасьці Чырвонай арміі.

«Дэкада абароны» павінна паслужыць штуршком да яшчэ большага ўзмацненьня ўвагі патрэбам Чырвонай арміі з боку шырокіх працоўных мас. Трэба ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, усім партыйным, савецкім, прафэсыянальным і грамадзкім арганізацыям неаслабна аказваць пастаянную дапамогу і падтрыманьне часьцям Чырвонай арміі, каб поўнасьцю забясьпечыць баявую вучобу. Трэба яшчэ больш умацаваць пралетарскі ўплыў на Чырвоную армію, для чаго стварыць пералом у шэфстве рабочых арганізацый, калгасаў і саўгасаў з Чырвонай арміяй, ператварыўшы гэта шэфства ў пенарыўную і пастаянную сувязь працоўных з чырвонаармейскімі масамі.

Палепшыўшы культурна-бытавыя ўмовы байцоў і начальніцкага складу, створым усе ўмовы для ўсямернага забесьпячэньня пасыпяховай баявой вывучкі чырвонаармейскіх часьцей.

Акружым гарачай любоўю дзіця Кастрычніка — Чырвоную армію. Працоўныя БССР у шчыльнейшым яднаньні з Чырвонай арміяй скарыстаюць «дэкаду абароны» для ўзьняцьця актыўнасьці ўсяе краіны па ўмацаваньню абароны.

Чырвоная армія — узброены вартаўнік пабудовы сацыялізму — будзе ўмацоўваць сваю магутнасьць, будзе моцным падтрыманьнем пралетарскіх мільёнаў.

Чырвоная армія, шчыльна згуртаваная з працоўнымі масамі, акружаная клопатамі і любоўю, непераможная стаіць на варце савецкіх межаў, на варце абароны пралетарскай дыктатуры.

Міжнародны капіталізм паломіць свае зубы аб сталёвую цьвярдыню краіны, якая будуе сацыялізм.

У «дэкаду абароны» трэба асаблівую ўвагу аддаць справе ваяізацыі рабочых, калгасьнікаў і працоўнага сялянства. Неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на работу Асоавіяхіму, гэтай масавай арганізацыі, якая ваяізуе рабочых і працоўнае сялянства. «Дэкада абароны» адначасова павінна быць дэкадай агляду работы Асоавіяхіму, пашырэньня членаў гэтай важнейшай арганізацыі, узмацненьня работы нізавых асоавіяхімаўскіх ячэек. Трэба максымальна скарыстаць «дэкаду абароны» для прапаганды справы ваяізацыі працоўных праз Асоавіяхім.

МАЦУЙ, ЧЫМ МОЖАШ АБАРОНУ!
Мацуй— вінтоўкай
Мацуй— штыхом!
Мацуй— жалезам!
Мацуй— агнём!
МАЦУЙ КАЛЁНУ ЗА КАЛЁНАЙ!



Узмоцнім абарону СССР

«Апошняя вайна» — якімі жорсткімі кпінамі гучаць гэтыя запэўніваньні буржуазных і сацыял-здрадніцкіх пісак сёньня, пасьля 16 гадоў ад пачатку крывавай імпэрыялістычнай бойні, калі капіталістычны сьвет зноў вядзе гонкі ў галіне ўзбраеньня, зноў ліхаманкава падрыхтоўвае новую сусьветную імпэрыялістычную вайну.

У парадку дня, як і 16 год таму назад, стаіць пытаньне новага перадзелу сьвету. Два імпэрыялістычныя гіганты сьвету — Англія і Амэрыка — рыхтуюцца да сьмяротнай схваткі за першынства ў сьвеце. Ад іх не адстаюць Францыя і Італія, якія вядуць жорстную, пакуль дыпляматычную барацьбу за гегемонію над берагамі Міжземнага мора.

Прагнасьць да нажывы штуркае капіталістычных драпежнікаў на самыя рызыкоўныя калёніяльныя авантуры. Нечаўвечная эксплёатацыя і зьдзекі «цывілізаваных» эксплёататараў выклікаюць супраціўленьне прыгнечаных калёніяльных народаў, узьнімаюць на паўстаньне супроць імпэрыялізму мільёны і мільёны калёніяльных рабоў.

Сучасны «мірны» перыяд сусьветнай гісторыі зьяўляецца на справе перыядам, калі пушкі, гарматы, танкі, крэйсэры, самалёты і ўдушлівыя газы ні на сэкунду ня спыняюць дзейнічаць, сьціраючы з зямлі цэлыя вёскі ў Індыі, Кітаі, Інда-Кітаі або ў Сярэдняй Амэрыцы.

Капіталістычны сьвет пасьля кароткатэрміновых стабілізацыйных ілюзій і надзей на «процветание» апынуўся ў віры жорсткага эканамічнага крызісу. На глебе гэтага крызісу ў вялізарнейшай ступені ўзрасьлі і агаліліся ўсе супярэчнасьці капіталістычнага ладу. Асабліва абвастрыліся клясавыя супярэчнасьці паміж эксплёатуемымі масамі і іх прыгнятальнікамі і эксплёататарамі. Беспрацоўе, голад, галеча зьяўляюцца крыніцай рэзкага абвастраньня рэвалюцыйнай барацьбы працоўных мас. Працоўныя масы вызваляюцца з-пад гіпнозу радыкальна-дэмакратычных фраз сацыял-здрадніцкіх, вызваляюцца з-пад уплыву і кіраўніцтва сацыял-фашыстых. Рэвалюцыйнае хваляваньне ўсё часьцей знаходзіць свой выраз у пераходзе мас у контр-наступленьне супроць буржуазіі і яе сацыял-фашысцкіх агентаў. Рэвалюцыя становіцца ўсё больш адчувальнай небясьпекай для буржуазіі, яна нарастае ў гарадох і ў вёсках імпэрыялістычных краін, таксама як і ў калёніях. Перад нарастаючым рэвалюцыйным крызісам буржуазія прабуе знайсьці ратунак у вайне. Яна спадзяецца ў шавіністычным чадзе затаіць усе сацыяльныя праблемы і супярэчнасьці.

У той час, калі капіталістычны сьвет трэпле жорстка ліхаманка крызісу, калі яго існаваньню пагражае нарастаючая пралетарская рэвалюцыя, на адной шостай зямной кулі ўжо адбываецца напружанае сацыялістычнае будаўніцтва. Перамогі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва пралетарыяту і працоўных мас пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі зьяўляюцца рашаючым стымулам, які ўзмацняе разьвіцьцё рэвалюцыйнага руху ва ўсім сьвеце. Вось чаму ўсе супярэчнасьці паміж капіталістычнымі драпежнікамі адступаюць на задні плян перад асноўнай супярэчнасьцю сучаснага перыяду, супярэчнасьцю паміж краінай пралетарскай дыктатуры і капіталістычным сьветам. Вось чаму пагроза контр-рэвалюцыйнай вайны блёку капіталістычных дзяржаў супроць Савецкага Саюзу зьяўляецца найбольш актуальнай небясьпекай.

Капіталістычныя дзяржавы рыхтуюць напад на Савецкі Саюз для таго, каб зьнішчыць у сябе ў тылу небясьпеку ператварэньня вайны імпэрыялістычнай у вайну грамадзянскую. Перад схваткай за новы перадзел сьвету яны прабуюць зьнішчыць пагрозу пралетарскай рэвалюцыі. Гэту сваю падрыхтоўку да вайны яны вядуць пад прыкрыцьцём крыку аб разбраеньні, выкарыстоўваючы ўдушлівыя газы самай подлай хлусьні, накіраванай супроць краіны пралетарскай дыктатуры і сацыялістычнага будаўніцтва. Малыя і вялікія капіталістычныя драпежнікі — Францыя, Польшча, Румынія, — узбройваючы да зубоў свае арміі, будуючы цытадэлі, марскія і паветраныя флёты, стратэгічныя дарогі, фабрыкі ўдушлівых газаў, адначасова ўзьнімаюць выцьцё аб мнімых савецкіх зьверствах і ўзбраеньнях.

Пасьля куцепаўшчыны пачалася сьвістапляска «крыжовага паходу». Правал «крыжовага паходу» паслужыў сыгналам да новай кампаніі супроць Савецкага Саюзу. Гэта кампанія, накіраваная супроць савецкага экспарту, павінна ўкараніць ў галовы дробнай буржуазіі, якую руйнуе ход эканамічнага крызісу і спэкуляцыйныя махінацыі буйнога капіталу, перакананьні, што ўнаватым у яе бядотах зьяўляецца савецкі экспарт. Так званая «дэмпінгавая кампанія» мае сваёй задачай — паралізаваць рост эканамічнай і палітычнай магутнасьці Савецкага Саюзу шляхам аспабленьня сацыялістычнага будаўніцтва ў нас і мабілізаваць пад камандай буржуазіі дробна-буржуазныя масы для ваеннага нападу на нашу краіну. Роўнапажна з «антыдэмпінгавай кампаніяй» імпэрыялістычныя драпежнікі арганізуюць ваенныя саюзы пад выглядам аграрных канфэрэнцый, мэтай якіх зьяўляецца арганізацыя сумеснага выступленьня супроць Савецкага Саюзу.

Буржуазны друк усяго сьвету і ў першую чаргу буржуазны друк фашысцкай Польшчы вядзе самую шалёную падрыхтоўку да вайны супроць Савецкага Саюзу. Аднак, тыя сымпатыі, якія выяўляюць працоўныя ўсяго сьвету ў адносінах да краіны пралетарскай дыктатуры, прыводзяць да таго, што ўся атака буржуазнага друку супроць Савецкага Саюзу не дасягае сваёй мэты. Таму апрача адкрытых заклікаў да нападу на Савецкі Саюз мы маем справу і з замаскаванымі спробамі ўцягнуць працоўныя масы ў ваенную авантуру супроць Савецкага Саюзу.

Нядаўна ў фашысцкай Польшчы буржуазная зграя, якая канкуруе з пануючай зграяй Пілсудзкага, а менавіта эндэкі (Польскія нацыянал-дэмакраты) выступіла з заявай, што на ўсходзе Польшчы нішто не пагражае і што небясьпека пагражае Польшчы з захаду. Вядома, гэта выступленьне эндэкаў не азначала ні «філё-савецкіх» настроў эндэкаў, ні тым больш яно не азначала пацыфізму. Проста эндэкі, якія ўлічвалі настрої мас, прабавалі мабілізаваць масы на вайну, зьвязаць іх па руках і нагах ваеннай палічнай дысцыплінай, выкарыстоўваючы атруту анты-нямецкіх шавіністычных настроў. Гэтыя хітрыя буржуазныя палітыкі добра разумелі, што масы, ахопленыя шавіністычным чадам, лёгка можна будзе накіраваць у патрэбны момант не на захад, а іменна на ўсход — супроць пралетарскай рэвалюцыі.

Пілсудчыкі не пажадалі адстаць ад эндэкаў і хоць яны вырасьлі на дрожджах філё-нямецкай арыентацыі, у сваёй часопісі «Моцарстовец» таксама выступілі з артыкулам, які заклікае да падрыхтоўкі вайны супроць Нямеччыны. Бязумоўна, яны таксама разьлічвалі на тое, што масы, скаваныя ваеннай дысцыплінай, ня змогуць разважаць, калі генэралы накіруюць іх не на захад, а на ўсход, бо ня важна матывоўка падрыхтоўкі вайны, а важна самая падрыхтоўка. Сутнасьць пытаньня не ў пагрозе Нямеччыне, а ў наступных заявах фашысцкага органу: «Мы павінны выхоўваць дысцыплінаваныя, баявыя рады польскай арміі ў духу такой гістарычнай адказнасьці, каб кожны польскі салдат разумеў, што ён змагаецца як за мінулае, так і будучае тысячагодзьдзе... Нам — вялікадзяржаўнікам — трэба запаліць у польскай арміі дух узвышанажорсткай і заядлай барацьбы, якая мяжуецца з фанатызмам». Вось праграма, якая падрыхтоўвае глебу для выкарыстоўваньня мас у якасьці гарматнага мяса, для барацьбы супроць краіны пралетарскай дыктатуры. У гэтым сутнасьць анты-нямецкіх крыкаў польскіх фашыстых.

Вядома, буржуазія, падрыхтоўваючы напад на Савецкі Саюз, разьлічвае на дапамогу сабе з боку ўнутранога ворага пралетарскай рэвалюцыі. І вялізарнейшыя посьпехі сацыялістычнага наступленьня, якія прыводзяць да ліквідацыі кулацтва, як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі, посьпехі, якія пэўдаўляюць сусьветную буржуазію дапамогі ў барацьбе з пралетарскай рэвалюцыяй з спрадзіны, прымушаюць сусьветных драпежнікаў яшчэ і яшчэ больш паскорыць ваенную падрыхтоўку для нападу на СССР.

Супроць антысавецкіх махінацый буржуазіі пралетарыят Савецкага Саюзу павінен узмацняць сваю рабоча-сялянскую Чырвоную армію. Вайсковай справе пралетарыят і працоўныя масы павінны аддаваць максымальную ўвагу, бо Чырвоная армія, глыбокае знаёмства з ваеннай навукай і тэхнікай зьяўляецца гарантыяй бясьпечнасьці нашай краіны і спакойнага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Пралетарыят Савецкага Саюзу павінен мабілізаваць усе свае сілы, не выключаючы ні жанчын, ні моладзі, прывесьці ў баявую гатоўнасьць прамысловасьць, калгасы, саўгасы, індывідуальныя бядняцка-сераднякцкія гаспадаркі, школы і ўстановы і г. д. для таго, каб узмаціць магутнасьць Чырвонай арміі і абароناздольнасьць нашай краіны.

У гістарычным падыёмку паміж пралетарскай краінай і сусьветнымі імпэрыялістычнымі драпежнікамі мы маем ня толькі такую добрую зброю, як непераможная Чырвоная армія, якая нядаўна ў асобе АДУА пакрылася новай незабыванай славай, але і гарачую сымпатыю і адданасьць сусьветнага пралетарыяту і эксплёатуемых працоўных мас. Пралетарыят усяго сьвету ня раз даваў і дае доказы, што ён здолее дапамагчы савецкаму пралетарыяту бараніць Савецкі Саюз — гэту сапраўдную бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету.

Узмоцнім абарону бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету! Гэта значыць: павядзем яшчэ больш бязьлітасную барацьбу з правымі апартуністымі — агентамі клясавага ворага ўнутры партыі і іх «лявацкімі» саюзьнікамі, а таксама супроць прымірэнцаў да ўсіх відаў апартунізму. Будзем ганьбіць недаацэнку ваеннай работы і работы ў галіне ваяізацыі працоўных мас Савецкага Саюзу, як яркае праяўленьне правага апартунізму на практыцы. Павядзем бязьлітасную барацьбу супроць гэтай недаацэнкі, барацьбу за генэральную лінію партыі супроць правых і «левых» апартуністых у абарону Цэнтральнага Камітэту нашай Ленінскай Камуністычнай партыі, цясьнейшым чынам уявяцем з пытаньнямі штодзённай дапамогі гэраічнай Чырвонай арміі, з работай па ўзмацненьні абароناздольнасьці нашай краіны.

ІМЧЫЦЦА ТРЫВОГА ЎДАРАМ ГРЫМОТ: —НЯ ХОЧАМ ЧУЖОГА, СВАЙГО НЕ ДАМО!

Прывітаньне газэце „Юнгер Ленінец“

«Зьвязда» шле сваё гарачае бальшавіцкае прывітаньне газэце «Юнгер Ленінец» з аднагадовым юбілеем яе існаваньня.

Піянэрская газэта «Юнгер Ленінец», якая выходзіць на яўрэйскай мове мае вялікае значаньне ў справе інтэрнацыянальнага выхаваньня юных ленінцаў—піянэраў і школьнікаў.

«Зьвязда» ўпэўнена, што ў будучым «Юнгер Ленінец» дасягне яшчэ большых посьпехаў у справе выхаваньня юных байцоў за ажыцьцяўленьне ленінскіх заветаў, за ажыцьцяўленьне пяцігодні за чатыры гады.

«Юнгер Ленінец» дасьць руйнуючы адпор усякім правым і «левым» апартуністым, якія перашкаджаюць справе будаўніцтва сацыялізму ў краіне саветаў.

Няхай жыве бальшавіцкі друк!
Няхай жыве «Юнгер Ленінец»!

Урачыстае пасяджэньне ЦС Асоавіяхіму.

СЕНЬНЯ, 15 лістапада, адбудзецца

Ўрачыстае пасяджэньне прэзыдыуму Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму БССР

разам з партыйнымі, камсамольскімі, прафэсыянальнымі арганізацыямі, рэйсаветамі Асоавіяхіму і Чырвонай арміяй,

прысьвечанае 10-годзьдзю ліквідацыі асноўных фронтоў грамадзянскай вайны, 10-годзьдзю са дня стварэньня ваенна-навуковага таварыства—заснавальніка Асоавіяхіму, 5-годзьдзю сьмерці М. В. Фрунзэ і адкрыцьцю кампаніі «дэкада абароны».

Пасяджэньне адбудзецца ў Беларэтэатры, а 18 гала.

Пасля пасяджэньня—пастаноўка Беларэтэатру «ГОРАД ВЯТРОЎ».

Уваход па запрашальных білетах.

Пастанова ЦК УсеКП(б)Б

МАСКВА, 14. Задачы «далейшага паляпшэньня друку і павышэньня яго ролі ў разгортваньні сацыялістычнага наступленьня» патрабуюць ад рэдактароў і ўсяго складу рэдакцыйных работнікаў сапраўды бальшавіцкай вытрыманасьці і арганізатарскіх здольнасьцей, уменьня па-баявому і неабходнымі тэмпамі арганізэўваць масы на вырашэньне асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Перабудова газэт на асьвятленьне пераважна пытаньняў эканомікі патрабуе прыцягненьня новых колаў актыву да работы рэдакцый: рабселькораў-ударнікаў, гаспадарнікаў, спэцыялістых і г. д.

Адзначаючы нездавальняючасьць падбору, а таксама складу, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі рэдакцыйных работнікаў, ЦК лічыць у сучасны момант рашуча неабходным, каб партарганізацыі ўдзялілі асобную ўвагу кадрам газэтных работнікаў і забясьпечылі правядзеньне ў жыцьцё пастановы ЦК аб выпучэньні на работу рэдактарамі таварышоў на партработу з членаў бюро парткомаў. Зусім нездавальняючай зьяўляецца работа па выпучэньні рабселькораў-ударнікаў у апараты на кіруючую работу рэдакцый. ЦК лічыць неабходным правядзеньне наступных мерапрыемстваў:

1. а) Неадкладна палепшыць склад супрацоўнікаў і работу цэнтральных рэдакцый шляхам прымацаваньня да іх частка слухачоў курсаў марксызму-ленінізму (рэдактарскае аддзяленьне) Інстытуту літаратуры і мовы Камакадэміі, КІЖ'а, вышэйшай школы прафруху пры УсеЦСПС (газэтнае аддзяленьне), а таксама з дазволу ЦК у кожным паасобным выпадку правяўшых сябе на літаратурнай рабоце слухачоў прамакадэміі, гандлёвай акадэміі, транспартнай акадэміі, ІКП, асьпірантуры камвузаў, каапэрацыйнага унівэрсытэту.

Абавязаць рэдактароў забясьпечыць сыстэматычную работу з прымацаванымі, улічваючы, што слухачы і асьпіранты КІЖ'а, Камакадэміі, рэдактарскіх аддзяленьняў курсаў марксызму, вышэйшай школы прафруху, камвузаў, павінны ня менш трэці свайго часу працаваць у парадку сваёй вытворчай практыкі ў газэце, з рэшта (прамысловая, гандлёвая, транспартная і плянавая акадэміі, асьпіранты камвузаў, каапэрацыйны унівэрсытэт і інш.) у парадку партыйнай нагрузкі з аслабаненьнем ад іншых яе відаў. Работу накіраваных у газэту слухачоў чырвонай прафэсуры прыраўнаць па сваім значэньні да пэдагагічнай.

Даручыць культпропу ЦК разам з рэктарамі і рэдакцыямі газэт вызначыць канкрэтны сьпіс і правесьці гэта мерапрыемства. Прапанаваць мясцовым парткомам правесьці тыя-ж самыя мерапрыемствы ў адносінах камвузаў, ВНУ, філіялаў ІКП, Камакадэміі, прамакадэміі. Апрача таго, прымацаваць да газэт эканамістых, гаспадарнікаў, асьпірантаў і настаўнікаў.

б) Арганізаваць сыстэматычную вучобу работнікаў рэдакцый газэт, ТАСС, ОГІЗ і радыё-цэнтру, у залежнасьці ад ступені іх падрыхтаванасьці на курсах марксызму (рэдакцыйнае аддзяленьне ІЛМ камакадэміі, КІЖ'а, вышэйшай школы прафруху (рэд. аддзяленьне) на мясцох у камвузах (аддзел газэтнай работы), усклаўшы на рэдактароў, бюро ячэек і навучальныя ўстановы кантроль за ходам вучобы гэтага актыву рэдакцый.

Выдаткі, патрэбныя для арганізацыі і правядзеньня вучобы, усклясьці на рэдакцыі і выдавецтвы газэт ОГІЗ, ТАСС і радыё-цэнтр.

2. Адной з асноўных крыніц фармаваньня кадраў газэтных работнікаў павінны быць раборы і селькоры-ударнікі. Рэдактары цэнтральных, раённых, краявых і абласных газэт павінны шырока разгарнуць выхаваньне гэтых кадраў шляхам арганізацыі кароткатэрміновых курсаў, гурткоў і г. д.

3. Вызначыць наступную сыстэму падрыхтоўкі кадраў:

а) Работнікаў цэнтральных, рэспубліканскіх, краявых і абласных газэт рыхтуюць курсы марксызму (рэдактарскае аддзяленьне), інстытут літаратуры і мовы Камакадэміі,

б) сярэдняе зьвяно гэтых газэт, а таксама рэдактароў буйных раённых і гарадзкіх газэт рыхтуе Камуністычны інстытут Журналістыкі (б. ГЕЖ). У іншага сканцэнтроўваецца навукова-дасьледчая работа ў галіне журналістыкі, дысцыплін. Работнікаў для прафдруку рыхтуе газэтнае аддзяленьне былых школы прафруху пры УсеЦСПС,

в) рэдактароў раённых газэт, а таксама фабрычна-заводзкіх, саўгасных, калгасных рыхтуюць аддзяленьні работнікаў друку мясцовых камвузаў, вячэрнія інстытуты журналістыкі,

г) літаратурныя і тэхнічныя кадры рыхтуюць толькі інстытуты, тэхнікумы, газэтвучы (школы газэтнага вучнёўства).

4. Для перападрыхтоўкі рэдактароў і іншых асноўных работнікаў рэспубліканскіх, краявых і абласных газэт арганізаваць пры КІЖ'ы не пазьней 1-га студзеня 1931 г. пастаянныя двух-трохмесячныя курсы на 50 чал. Курсы марксызму, інстытут літаратуры і мовы Камакадэміі, КІЖ, камвузы, і радыё-цэнтр павінны забясьпечыць пастаянку завочнай вучобы газэтных работнікаў, перш за ўсё раённых і нізавых.

5. Культпрападдзелу ЦК у разьвіцьцё гэтай пастановы выпрацаваць спэцыяльныя мерапрыемствы, якія забясьпечылі падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў нацыянальнага друку.

6. Даручыць Культпрападдзелу ЦК распрацаваць шырокі плян падрыхтоўкі газэтных кадраў і ўнесьці на зацьвярджэньне ЦК кантынгенты вучняў будучага году з улікам таго, што ў КОНЫМ РАЁНЕ ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ ПАВІННА БЫЦЬ САМАСТОЙНАЯ ГАЗЭТА. У сувязі з гэтым вызначыць кантынгент асьпірантуры.

7. Прапанаваць рэдакцыям асьвятляць пытаньні падрыхтоўкі кадраў друку.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ДА ПОЎНАГА РАЗГРОМУ

БІЦЬ ПА ПРАВА - „ЛЯВАЦКІМ" ВЛЁКУ

Кулацкая агентура—правыя і „левыя" апартуністыя, стаўшы рупарам контр-рэвалюцыйных элемэнтаў і сусьветных інтэрвэнтаў, імкнуцца падарваць тэмпы сацбудаўніцтва—звузіць базу павышэньня абароназдольнасьці СССР

Мабілізаваць партыйныя масы на поўнае і няухільнае ажыцьцяўленьне пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б

Біць па апартуністычнай недаацэнцы

Толькі на базе індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, пры ажыцьцяўленьні разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце наша партыя, апіраючыся на актыўнасьць шматмільённых мас рабочых і працоўнага сялянства, можа ўмацоўваць абароназдольнасьць пралетарскай дзяржавы, павышаць баявую моц Чырвонай арміі.

Капітулянцкія ўстаноўкі правых і «левых» апартуністых, установкі агентуры варожае клясы, якія прадыктаваны інтарэсамі кулацка-капіталістычных элемэнтаў, накіраваны на паніжэньне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, на звужэньне базы, якая забясьпечвае эканамічную самастойнасьць СССР і павышэньне абароназдольнасьці пралетарскай дзяржавы. Імкненьні правых і «левых» апартуністых павярнуць краіну на шлях мінімалісцкіх тэмпаў індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, накіраваныя на ладрыў абароназдольнасьці краіны дыктатуры пралетарыяту, граюць на руку сусьветным інтэрвэнтам імпэрыялізму. Таму ўся партыя бязьлітасна, з бальшавіцкай непрымірымасьцю змагаецца супроць правага і «левага» апартунізму, супроць права-«лявацкага» блёку, ачышчаючы свае рады ад рэнэгатаў камунізму—двурушнікаў і здраднікаў інтарэсам пралетарыяту.

Бальшавіцкая партыя, перамагаючы апартуністычныя ўхілы ад ленінізму, будзе няўхільна павышаць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва і гэтым самым замацоўваць абароназдольнасьць краіны. Наша партыя на працягу ўсяго пэрыяду сваёй дзейнасьці і змаганьня за поўную перамогу сацыялізму, ажыцьцяўляючы мірную палітыку, ні на момант не аспабляла і не аспабіць сваёй увагі да справы абароназдольнасьці краіны.

XVI партыйны зьезд у сваёй пастанове па справаздачы ЦК УсеКП(б) паказаў «на необходнасьць згуртаваньня ўвагі партыі і яшчэ большай мабілізацыі ўсіх сіл рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства на ўмацаваньне абароназдольнасьці СССР, моцы і баяздольнасьці Чырвонай арміі, марскога і паветранага флёту». Гэта абавязвае ўсе партыйныя арганізацыі ў сваёй масавай рабоце на фабрыках, заводах, саўгасах, калгасах і сярод бядняцка-серадняцкіх мас сялянства максымум увагі аддаць справе разгортваньня работы па ваяннізацыі. Праз арганізацыі Асоавіяхіму партыйныя ячэйкі павінны накіроўваць актыўнасьць рабочых мас і працоўнага сялянства на справу павышэньня абароназдольнасьці пралетарскай дзяржавы.

У радзе выпадкаў яшчэ да гэтага часу мы наглядаем рад момантаў недаацэнкі разгортваньня работы па ваяннізацыі, недаацэнку ваеннай небясьпекі. Сям-там яшчэ сустракаемся з такімі гутаркамі, якія зыходзяць ад асобных партыйцаў, часамі нават кіраўнікоў нізавых арганізацый, што, бачыце, «мы заняты выкананьнем прамфінпляну і нам няма часу разгортваць работу па ваяннізацыі рабочых мас». Гэтым настроям і гутаркам трэба даць бязьлітасны адпор. Партыйныя ячэйкі павінны з бальшавіцкай непрымірымасьцю змагацца супроць недаацэнкі значэньня работы па ваяннізацыі, бо НЕДААЦЭНКА ВАЕННАЙ НЕБЯСЬПЕКІ, НЕДААЦЭНКА ЗНАЧЭНЬНЯ ЎЗДЫМУ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ КРАІНЫ ЁСЬЦЬ НАЙГОРШЫ ВІД ПРАЯЎЛЕНЬНЯ ПРАВАГА АПАРТУНІЗМУ.

Праводзячы змаганьне за лінію партыі, ячэйкі КП(б)Б павінны забясьпечыць поўнае выкананьне дырэктыў партыі аб мабілізацыі мас на справу павышэньня абароназдольнасьці СССР і баявой моцы Чырвонай арміі. Задача кожнай парт'ячэйкі заключаецца ў тым, каб работу па ваяннізацыі шчыльна ўвязаць з задачамі павышэньня тэмпаў разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці.

З сёньняшняга дня праводзіцца «дэкада абароны». Першачарговая задача, якая пастаўлена дэкадай, гэта прапаганда пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) па ўмацаваньні абароназдольнасьці краіны, па далейшым разгортваньні індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі—па ўмацаваньні базы абароназдольнасьці краіны.

«Дэкада абароны» павінна зьвіцца тым пераломным пэрыядам, пачынаючы ад якога партыйныя ячэйкі ў некалькі раз палепшаць сваё кіраўніцтва работай асоавіяхімаўскіх арганізацый, разгорнуць работу па ваяннізацыі працоўных мас насельніцтва,

Даб'емся зруху ў ваяннізацыі камсамолу

Камсамольская арганізацыя, як бліжэйшы памочнік партыі, павінна ўзмацніць сваю работу па ваяннізацыі сваіх радоў і па ўзмацненьні наогул сваёй работы па абароназдольнасьці краіны. Тыя тэмпы работы па ваяннізацыі, якія зараз ёсьць у камсамоле, ні ў якім разе не адпавядаюць тым вялізным палітычным задачам, якія пастаўлены партыяй перад камсамольскай арганізацыяй. Асноўнымі задачамі, якія стаяць перад камсамолам у гэтым напрамку, павінны быць наступныя.

Патрэбна самым рашучым чынам павесьці змаганьне з апартуністычнай недаацэнкай, якая ёсьць у паасобных эвэньнях камсамолу, работы камсамольцаў у органах Асоавіяхіму. Лёзунг, высунуты ЦК ЛКСМБ **аб 100-процентным уступленьні камсамольцаў у Асоавіяхім і аб актыўнай штодзённай рабоце ў органах Асоавіяхіму**, павінен зьявіцца важнейшым зьвяном у рабоце камсамольскіх арганізацый. Неабходна работу паставіць такім чынам, каб камсамольская арганізацыя стала сапраўдным начальнікам і арганізатарам ініцыятывы шырокіх мас рабочай, калгаснай, батрацкай, бядняцкай і серадняцкай моладзі ў рабоце органаў Асоавіяхіму на іх шырокім уцягненьні ў гэту арганізацыю. Трэба павесьці рашучае змаганьне з фармальнымі і казённымі адносінамі да гэтай работы.

Важнейшым зьвяном у рабоце камсамолу павінна зьявіцца **сувязь з Чырвонай арміяй**. Да гэтага часу мы наглядаем шмат фактаў падмены штодзённай работы ячэек з часьцямі Чырвонай арміі пустым фразэрствам, траскатнёй, шматлікімі рэзалюцыямі і г. д. Штодзённая сувязь з Чырвонай арміяй, вывучэньне быту, вучобы і жыцьця Чырвонай арміі камсамольскімі ячэйкамі, практычная і узаемная дапамога ў рабоце — вось асноўныя цункты, на якіх павінна праходзіць работа камсамольскіх ячэек. Трэба разгарнуць сярод шырокіх мас камсамольцаў і беспартыйнай моладзі і асабліва сярод дапрызыўнікаў ініцыятарам па папулярызацыі **вайсковай прапаганды** сярод шырокіх мас прапоўнай моладзі і дарослых рабочых. У часе «дэкады абароны» неабходна разгарнуць шырокую работу па вывучэньні ваеннай тэхнікі, асабліва авіяцыі і хіміі, з такім разьлікам, каб азнаёміць шырокія масы з іх роляй і значэньнем ў абароназдольнасьці краіны. Масавая работа ячэек павінна таксама быць прасякнута гэтым пытаньнем. Камсамол Беларусі **узяў шэфства над АБВШ**. Гэта абавязвае кожную камсамольскую ячэйку ні толькі ўзмацніць непасрэдную сувязь з вайсковай школай, але і на месцы быць асноўным рэзэрвуарам, адкуль вайсковыя школы павінны чэрпаць новыя кадры для падрыхтоўкі чырвоных камандзіраў.

Шэфства ўскладае палітычна адказьнейшыя задачы на камсамольскую арганізацыю. Кожная камсамольская ячэйка павінна вакол шэфства над АБВШ разгарнуць шырокую растлумачальную работу, растлумачыць масам камсамольцаў аб умовах жыцьця і вучобы чырвоных камандзіраў і сваёй непасрэднай сувязьзю і практычнай дапамогай аказаць падтрыманьне АБВШ у выкананьні ёю адказьнейшай задачы на падрыхтоўцы чырвоных камандзіраў.

Пытаньні абароназдольнасьці краіны і ваяннізацыі павінны закрануць таксама **піянэрскую арганізацыю і неарганізаваных дзяцей**. Камсамол павінен разгарнуць у гэтым напрамку шырокую работу.

«Дэкада абароны» павінна зьявіцца для камсамольскай арганізацыі магутным штуршком для далейшага разгортваньня сярод мас камсамольцаў і беспартыйнай рабочай, батрацкай, бядняцкай і серадняцкай моладзі далейшай упартай работы па ваяннізацыі і абароназдольнасьці нашае краіны. «Дэкада» павінна паказаць магутны падмурак для выкананьня важнейшых задач, якія стаяць перад камсамольскай арганізацыяй па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны.

А. Д.

Забясьпечыць пералом

У радзе вытворчых і савецкіх ячэек КП(б)Б **Кастрычніцкага** раёну наглядаецца апартуністычная недаацэнка вайсковай работы. Канкрэтныя дырэктывы райкому КП(б)Б і райсавету Асоавіяхіму аб рабоце па ваяннізацыі на мясцох выконваюцца зусім нёвыстарчальна. Многія ячэйкі Асоавіяхіму на прадпрыемствах абмяжоўваюцца толькі вярбоўкай новых членаў і зборам членскіх узносаў, дый то не заўсёды рэгулярна.

За 9 месяцаў бягучага году раённая арганізацыя Асоавіяхіму вырасла з 9 да 13 тыс. чал., арганізавана на прадпрыемствах 30 вайсковых гурткоў, у рабоце якіх прымае ўдзел 860 чал., але кіраўніцтва работай на ваяннізацыі з боку парт'ячэек праводзіцца далёка не ў адпаведнасьці з задачамі ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Абсьледваньнем работы ячэек Асоавіяхіму выяўлена, што на большасьці прадпрыемстваў работа на ваяннізацыі плянава не праводзілася, асабліва за летні час. На заводзе **«Энэргія», абутковай майстэрні, каўбасная фабрыцы, хладабойні,** фабрыцы **«Чырвоны Хэмін»** на працягу 5-6 месяцаў ніякай практычнай работы на ваяннізацыі ня было. Партыйныя ячэйкі паказаных прадпрыемстваў гэтай галінай работы ня цікавіліся, праяўлялі недапушчальную бязьдзейнасьць. Як агульнае зьявішча, вызначаюцца тры дні ў месяц для заняткаў вайсковых гурткоў на многіх прадпрыемствах займаюцца іншымі відамі грамадзкай работы. Вылучаныя таварышы на асоавіяхімаўскую работу перагружаюцца іншымі абавязкамі. Наглядаецца вялікая дакучасьць складу сакратароў ячэек Асоавіяхіму, што бязумоўна адбіваецца на рабоце.

Прычыны палаўнасьці раду адмоўных фактаў у рабоце па ваяннізацыі заключаецца ў недаацэнцы яе важнасьці многімі партыйнымі ячэйкамі, у няверным і шкодным настаноўцы пытаньня «што важней». З-за гэтага «што важней» выглядае апартунізм на практыцы па ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі ў справе ваяннізацыі працоўных мас. Найбольшай бязьдзейнасьцю ў гэтай галіне работы адзначаецца партыйнае і прафсаюзнае кіраўніцтва заводу **«Энэргія»**. Там **вайсковы куток занялі пад буфат, а ўсе экспанаты і вайсковую літаратуру замкнулі ў шафе.** Сакратар партыйнай арганізацыі т. **Карначоў** палічыў, што рабочым няма часу займацца вайсковай справай і **распарадзіўся адаслаць усе стрэльбы і стрэлковыя прылады ў падшэфны калгас.** Грунтуючыся на ліквідацыйных настроях у адносінах да ваяннізацыі работы кіраўніка партыйнай арганізацыі заводу, старшыня заўкому тав. **Гнядзько** на заўвагу работніка райсавету Асоавіяхіму адказаў: «Калі вы лічыце, што мы бязьдзейнічаем, дык шукайце вольных людзей і заводзьце з імі вайсковую работу самі».

Бараз, у сувязі з падрыхтоўкай да «дэкады абароны», ёсьць некаторае ажыўленьне ў рабоце ячэек Асоавіяхіму, бліжэй да тэмай справы падыйшлі партыйныя ячэйкі, але камсамольская раённая арганізацыя яшчэ да гэтага часу не разварушылася.

«Дэкада абароны» павінна ўнесьці пералом у работу партыйных ячэек па разгортваньні і кіраўніцтве справай ваяннізацыі, што зьўлялецца адным з сустаўных частак работы па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны.

Ів.

Работа па ваяннізацыі—закінуты вучастак

Парткалектыў ф-кі «Кастрычнік» (Менск) недаацаніў палітычнага значэньня работы па ваяннізацыі. Да гэтага часу ні адна з фабрычных арганізацый не абгаварыла пытаньня аб правядзеньні «дэкады абароны». Больш таго, асобныя цэхавыя партыйныя і камсамольскія ячэйкі нават аўсім ня ведаюць, што з 15 лістапада праводзіцца «дэкада абароны».

На фабрыцы ёсьць актыў з дэмабілізаваных чырвонаармейцаў і камскладу запасу. У мінулым годзе камскладам запасу была разгорнута досыць шырокая работа па ваяннізацыі, але камклад у сваёй рабоце не атрымаў патрэбнай дапамогі з боку партыйных і камсамольскіх ячэек і прафсаюзу, у выніку работа занепала.

Калі камсамольцы і беспартыйныя рабочыя праяўляюць вялікую зацікаўленасьць да вайсковае работы, дык пераважная частка членаў партыі на работу па ваяннізацыі глядзіць, як на зусім лишнюю, непатрэбную рэч. Ні адзін з членаў партыі ня выказаў свайго жаданьня працаваць у гурткох на ваяннізацыі.

Р — ы.

У стане застою

Работа па ваяннізацыі **на заводзе «Дрэвапрацоўшчык»** (Менск) у заняпадзе. Ні бюро партыйнага, ні бюро камсамольскага калектыву работай па ваяннізацыі ня цікавілася. На працягу цэлага году, бюро партыйнага калектыву ні разу не заслухоўвала справаздачы ні аб рабоце ваеннога, ні бюро Асоавіяхіму. Камсамольскі калектыў толькі напярэдадні «дэкады абароны» сабраўся выслухаць арганізатара работы на ваяннізацыі.

Гурток на вывучэньні вайсковых ведаў разваліўся. Фабком вынес пастанову, аб арганізацыі стрэлковага ціру пры заводзе, але далей пастановы не пайшоў. Вучоту членаў Асоавіяхіму на прадпрыемстве няма. Куток Асоавіяхіму пры лепкутку закрыты.

Завод шэфствуе над Ж-скім капнойным пазком. Пастаянная работа на шэфстве няма. У рэвалюцыйныя сьвяты чырвонаармейцы бываюць на вечарох рабочых, а падшэфны полк наведваецца сакратаром ячэйкі Асоавіяхіму. У гэтым і заключаецца ўся шэфская «работа». Ні рабочыя, ні нават партыйнае кіраўніцтва незнаёма з жыцьцём падшэфнай часьці.

Паасобныя члены партыі няўважліва адносяцца да работы па ваяннізацыі.

Такое становішча зьяўляецца ненармальным. Партыйны калектыў павінен у сваёй масавай рабоце максымум увагі аддаць справе мабілізацыі мас на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны, на разгортваньне работы па ваяннізацыі.

Р—н.

Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі

У дзень трынаццатай гадавіны вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі ЦК КПЗБ шле вам ад імя камуністых і рэвалюцыйных працоўных Зах. Беларусі сваё гарачае прывітаньне. Вітаем вас з кевымі перамогамі і дасягненьнямі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, у галіне ўмацаваньня і росту Савецкай Сацыялістычнай Беларусі.

Усе гэтыя новыя перамогі і дасягненьні зьяўляюцца лепшым довадам правільнасьці генэральнай лініі бальшавіцкае партыі і яе ленінскага ЦК. Рашучае і непрымірымае змаганьне, якое ведзяцё вы супроць правых і «левых» капітулянтаў, супроць двурушнікаў і здраднікаў партыі, супроць нацыянал-апартуністых, супроць усіх гэтых агентаў кляса ворага ў партыі, зьяўляецца зарукай далейшых перамог над клясавым ворагам, зарукай пасьпяхова разгорнутага будаўніцтва сацыялізму. ЦК КПЗБ цалкам і поўнасьцю згодзен з лініяй кіруючай партыі Камінтэрну—УсеКП(б) і яе ЦК на чале з тав. Сталіным, цалкам і поўнасьцю згодзен з лініяй, якая ажыцьцяўляецца КП(б)Б і яе бальшавіцкім ЦК. Цьвёрдае і няўхільнае ажыцьцяўленьне гэтай лініі забясьпечвае рост і ўмацаваньне Савецкага Саюзу і яго неадрыўнай часьці Савецкай Беларусі, якія прыкоўваюць да сябе ўзрастаючыя сымпатыі працоўных мас Польшчы і Зах. Беларусі. Ваша бальшавіцкая непрымірымасьць і пасьлядоўнасьць у змаганьні за лінію Леніна служыць нам прыкладам у тым змаганьні, якое вядзе наша партыя на аснове бальшавіцкіх пастаноў V зьезду КПП супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі (група Варскага-Кастшэвы-Лапінскага), супроць «левых» апартуністых, супроць двурушніцтва і прымірэнцтва, за бальшавіцкую лінію.

Гадавіну Кастрычніка працоўныя масы Заходняй Беларусі і Польшчы сустракаюць у абстаноўцы абвостранага клясавага змаганьня, ва ўмовах нарастаючых магутных баёў супроць фашысцкай дыктатуры і яе агентаў сацыял і нацыянал-фашыстых. Да надыходзячых выбараў у сойм наша партыя, пад кіраўніцтвам ЦК КПП, ідзе з разгорнутай праграмай рэвалюцыі і, ня гледзячы на шалёны тэрор, ня гледзячы на вялізарнейшыя перашкоды фашысцкіх рэпрэсій, мабілізуе пад сваімі рэвалюцыйнымі лёзунгамі шырокія масы рабочае клясы і працоўнага сялянства ЗБ. Мы скарыстаем выбары для рэвалюцыйнай мабілізацыі мас, для рашучага клясавага змаганьня з апупантамі, мы заклікаем масы ісьці на выбары з думкай аб узброеным паўстаньні, якое скіне фашысцкую дыктатуру і ўстановіць уладу саветаў.

Перад тварам абвостранай падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу з боку міжнароднага і польскага імпэрыялізму, саюзьнікамі якога зьяўляюцца шкодніні, шпіёны, контр-рэвалюцыйныя нацыянал-дэмакраты, буржуазна-кулацкія элементы савецкай краіны,—наша партыя арганізуе масы працоўных на змаганьне і абарону Савецкага Саюзу супроць імпэрыялістычных ваенных плянаў. Зараз, калі небясьпечна імпэрыялісцкай вайны і перш за ўсё вайны супроць краіны Саветаў зноў і зноў навісае над сьветам, працоўныя ЗБ заяўляюць, што яны аддадуць сваё жыцьцё на абарону рэвалюцыйнай бацькаўшчыны падняволеных і прыгнечаных усяго сьвету—СССР.

У дзень гадавіны мы будзем выступаць пад лёзунгамі абароны СССР і папулярызацыі таго вялікага будаўніцтва сацыялізму, якое разгортваецца ў вас.

Няхай жыве Савецкі Саюз! Няхай жыве УсеКП(б) і яе правадыр т. Сталін!

Няхай жыве Кастрычнік у Польшчы!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя і яе штаб Камінтэрн!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ЗАХ. БЕЛАРУСІ.

Вільня, кастрычнік 1930 г.

Фракцыянэраў-двурушнікаў—вон з бальшавіцкіх радоў

Агульны сход парткалектыву Менскай абутковай фабрыкі, заслухаўшы даклад т. Гантмана аб фракцыйнай дзейнасьці Сырцова, Ламінадзэ, Шацкіна і іншых правых і «левых» апартуністых, канстатуе, што правыя ўхілы ня толькі не зламаны арганізацыйнай і ідэйнай зброі змаганьня супроць партыі, а паздвароты, з такой-жа сілай, як і клясавы вораг, актывізуюцца ў змаганьні супроць генэральнай лініі партыі, ужываючы усякія сродкі, як ашуканьне, фракцыйнасьць, двурушніцтва.

Парткалектыў поўнасьцю далучаецца да пастановы бюро ЦК КП(б)Б ад 10-XI адносна фракцыйнай дзейнасьці Сырцова, Ламінадзэ і інш. і патрабуе ад былых лідэраў правага ўхілу Бухарына, Рыкава і Томскага выразнага адказу: ці яны будуць разам з партыяй змагацца за зе генэральную лінію, супроць правых і «левых» апартуністых, ці яны і надалей будуць прытрымлівацца сваіх поглядаў, паўнасьць якіх прызнана XVI зьездам несумяшчальнай з прыналежнасьцю да УсеКП(б).

Разглядаючы маўчаньне Бухарына, Рыкава і Томскага, як згоду з усімі паводзінамі правых і «левых» апартуністых супроць ленінскага ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі т. Сталіна, партсход просіць ЦК УсеКП(б) ужыць да лідэраў правага ўхілу рашучыя меры, грунтуючыся на пастановах XVI зьезду УсеКП(б).

Сход парткалектыву запэўнае ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, што яшчэ з большай энэргіяй і настойлівасьцю будзе змагацца з усялякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі, як супроць правага ўхілу, які прадстаўляе галоўную небясьпеку на даным этапе, так і супроць рэшткаў контр-рэвалюцыйнага трацкізму і прымірэнчых адносін да ўхілаў ад ленінізму, выганяючы з радоў партыі фракцыянэраў, двурушнікаў і усіх тых, хто сваімі паводзінамі зрывае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Пакончыць з права-„лявацкай" фракцыйнасьцю

(З рэзалюцыі сходу ячэйкі КП(б)Б Наркамаўветы БССР)

Правыя апартуністыя, якія адлюстроўваюць ідэалёгію і настрої куланцкіх элемэнтаў у краіне, сталі на шлях двурушніцтва, ашуканства партыі, змаканьня з клясавымі ворагамі. Актывізацыя іосьбітаў дробна - буржуазных хістаньняў у партыі зараз выяўляецца ў новых формах змаганьня супроць партыі, у стварэньні права-«лявацкага» блёку (Сырцоў, Ламінадзэ, Шацкін, Стэн і інш.), у фракцыйнай падрыўной рабоце.

Такога становішча нельга пярпець унутры ленінскай партыі, якая заўсёды была, ёсьць і застанецца адзінай, маналітнай партыяй. Тым больш партыя не дапусьціць двурушніцтва і здраднічтва ў сваім штабе—ЦК і ЦКК.

Індустрыялізацыя—аснова абароназдольнасьці краіны

Савецкі Саюз, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, ідзе па шляху посьпехаў і перамог. Начуванымі ў гісторыі тэмпамі расьце народная гаспадарка нашай краіны. Расьце дабрабыт шырокіх працоўных мас. Гэта ў нас.

А ў іх? Эканамічны крызіс краін капіталізму, які перарастае ў крызіс палітычны, азначае наближэньне канца капіталістычнай стабілізацыі, азначае наближэньне новых рашаючых рэвалюцыйных баёў. Міжнародны пралетарыят, які стогне пад цяжарам капіталістычнай рацыяналізацыі, які ёсьць у ціскох нячуванага бесьпрацоўя, пераходзіць да контр-наступленьня на буржуазію.

Такая ацэнка мае ў сабе момант пасьпярэньня спробы капіталістычных краёў да новай вайны супроць Савецкага Саюзу. Ленін з гэтага поваду пісаў: **«І чым глыбей, чым больш пагражаюча будзе расьці камуністычны рух, тым больш паўторных спроб зробяць яны для задушэньня нашай рэспублікі»** (Ленін, том XXVI).

Камуністычная партыя Савецкага Саюзу, таксама як і ўвесь Камуністычны Інтэрнацыянал, добра ўяўляе сабе тое, што небясьпека новай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу ненасрэдна навісла. Таму наша партыя намагае ўсе свае сілы да яшчэ большага ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны. XVI партызезд, лаўны арганізму міжнароднаму становішчу Савецкага Саюзу, зьвярнуў увагу «на необходнасьць сканцэнтраваньня ўвагі партыі да яшчэ большай мабілізацыі ўсіх сіл рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства на ўмацаваньне абароназдольнасьці СССР, магутнасьці і баяздольнасьці Чырвонай арміі, марскога і паветранага флёту».

У чым база абароназдольнасьці краіны? Базай абароназдольнасьці краіны зьяўляецца ў першую чаргу індустрыялізацыя, ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі на «ператварэньне нашай краіны з аднатай, аграрнай у перадавую прамысловую». Гігантцкае пераўкраваньне нацягадовага пляну зьяўляецца самым сапраўдным умацаваньнем абароназдольнасьці нашай краіны.

Наша краіна ператвараецца ў краіну металічную: мы будуем сусьветныя гіганты Магнітагорск, Кузьнецкі завод і інш., пашыраем існуючыя заводы з тым, каб да канца пяцігодкі высьці з выпрацоўкай у 17 млн. тон чыгуна, заняўшы другое месца па здабычы чыгуна ва ўсім сьвеце, пакінуўшы за сабой Нямеччыну, Францыю, Англію і Бэльгію.

Мы разьвіваем гігантскімі тэмпамі каменна-вугальную прамысловасьць, дасягнуўшы ужо ў 1930-31 годзе выпрацоўкі ў 70-72 млн. тон каменнага вугалю г. зн., выканаўшы праграму апошняга году пяцігодкі ў 75 млн. тон каменнага вугалю.

Мэталь, апал—каманднымі зьвенькі ў народнай гаспадарцы, якія разьвіваюцца буйнымі тэмпамі, складаюць цьвёрдую, надзейную базу абароназдольнасьці краіны. Партыя выконвае дырэктывы XVI зьезду ад узмацненьні разьвіцьця хімічнай прамысловасьці і вытворчасьці каляровых мэталяў, якія адыгрываюць важнейшую ролю ў справе абароны краіны.

Сусьветны імпэрыялізм, які ўсімі сіламі, ва ўсіх галінах падрыхтоўвае новую інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу, добра разумее значэньні індустрыялізацыі Савецкага Саюзу, выкананьня пяцігодкі, асноўнай часткай якой зьяўляецца ажыцьцяўленьне гэтай індустрыялізацыі,—добра разумее тое, што абароназдольнасьць Савецкага Саюзу расьце шпаркімі тэмпамі. Адзін са злосных ворагаў Савецкага Саюзу відомы сваімі антысавецкімі выступленьнямі Леслі Уркварт нядаўна та ахарактарызаваў гэта: «Выкананьне пяцігодкі дае ў рукі Савецкага Саюзу сродку, пагражаючую самому існаваньню капіталістычнага ладу».

Нядаўна выкрытыя АДПУ шкодніцкія арганізацыі, якія на дырэктывах капіталістычных контр-разьведак падрыхтоўвалі інтэрвэнцыю імпэрыялістых сьцьвідома вялі работу на падрыве і затрыманьні разьвіцьця нашай прамысловасьці, а асабліва цяжкай індустрыі. У паказаньнях, даных АДПУ шкодникам з «прампартыі», апошнія прызнаюцца і тым, што яны падрывалі разьвіцьцё, вугальнай, мэталюргічнай, машына-будаўнічай прамысловасьці.

Агентура Рамзіных, Кандрацьцевых у радох нашае партыі—правыя апартуністыя і «левыя», якія з імі зблёкваліся на глебе правай платформы, для барацьбы супроць партыйнага кіраўніцтва, выступаюць за замаруджваньне тэмпаў разьвіцьця нашай індустрыі, шкодзяць справе абароназдольнасьці нашай краіны, граюць на руку інтэрвэнтам.

Партыя будзе і надалей няўхільна змагацца на два фронты. Партыя бязьлітасна выкіне са сваіх радоў апартуністых, партыя зломіць хрыбет тым, хто спрабуе падрыўной фракцыйнай работай стаўіць палкі ў колы сацыялістычнаму наступленьню. Барацьба за выкананьне лініі партыі, за ажыцьцяўленьне яе ў больш хуткі гістарычны тэрмін, зьяўляецца важнейшай гарантыяй нашай перамогі ў надыходзячым узброеным канфлікце сацыялістычнай і капіталістычнай сыстэмы.

С.

АСІНБУДАЎСКІ ЎДАР ПА НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНАЙ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫІ

У дні Кастрычніцкай гадавіны пачала працаваць першая магутная электрастанцыя БССР. У гэтай падзеі заложая **глыбокі палітычны сэнс.** Адкрыцьцё Сталінскай станцыі — гэта адзін з важнейшых і буйнейшых этапаў на шляху будаўніцтва сацыялістычнай, свабоднай Беларусі.

Адкрыцьцё і пачатак работ электрастанцыі, зьяўляючыся вялікай перамогай на фронце індустрыялізацыі раней адсталай і малакультурнай Беларусі, сьведчыць перш за ўсё аб перамогах **правільнай генэральнай лініі партыі.** Зараз, калі мы бачым новае ажыўленьне праваапартуністычных элемэнтаў у нашай партыі, зараз, калі мы адзначаем стварэньне бяспрынцыпнага права - «лявацкага» блёку прасмаленых двурушнікаў і дробна - буржуазных нітрыгаваў, зараз, калі зноў і зноў выцягваецца старая заржавелая зброя контр - рэвалюцыйных паклёпаў на партыю і рабочую клясу, — адкрыцьцё Асінаўскай электрастанцыі, як рэзультат нашай палітыкі і найвялікшага творчага энтузіязму пралетарскіх мас, зьяўляецца магутным ударам па ўсіх гэтых антыпартыйных элемэнтах.

Станцыя імя Сталіна зьяўляецца адначасова ўдарам і па ўсёй нацыяналістычнай контр - рэвалюцыі і яе агентуры ўнутры нашай партыі. Адкрыцьцё гэтай станцыі ў нас на Беларусі зьяўляецца зрэшт наказальнікам таго, як наша партыя на практыцы, на справе правільна ажыцьцяўляе ленінскую нацыянальную палітыку.

Кастрычніцкая рэвалюцыя вызваліла прыгнечаныя царызмам народы. Установленая рэвалюцыяй пралетарская дыктатура крок за крокам, упарта і настойліва змагалася і змагаецца за ліквідацыю рэшткаў фактычнай няроўнасьці, якая засталася нам у спадчыну ад каляніяльнай, імпэрыялістычнай палітыкі расійскага царызму. Гэта змаганьне за ліквідацыю рэшткаў фактычнай няроўнасьці і азначае пасьлядоўную і цьвёрдую лінію на гаспадарчае і культурнае адраджэньне раней прыгнечаных і адсталых народаў, дапамогу ім з боку ўсяго Савецкага Саюзу, ператварэньне адсталых, галоўным чынам, аграрных па сваёй гаспадарчай структуры, раёнаў, вобласьцяй і рэспублік у рэспубліку калгасна - індустрыяльныя, у раёны з высока разьвітай прамысловасьцю і сацыялістычнай сельскай гаспадаркай. На практыцы кожны новы завод і фабрыка ў нашай БССР азначае новы крок наперад на шляху ліквідацыі адсталасьці, якая гістарычна зладжылася ў рэзультаце ўсёй царскай палітыкі, новы крок наперад на шляху будаўніцтва сацыялістычнай культуры, новых сацыялістычных адносін. На базе Асінбудаў мы будуем моцны гмах сацыялістычнай Беларусі, мы ажыцьцяўляем нашы вялікія гістарычныя задачы набудовы сацыялізму і ліквідацыі праклятага мінулага. Толькі ідучы шляхамі ленінскай партыі, толькі ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку, мы змаглі дабіцца такіх вялізарнейшых перамог і дасягненьняў у галіне будаўніцтва БССР. Асінбуд — гэта ненарыўная частка, гэта плоць ад плоці ўсёй нашай палітыкі, якая вядзе да зьвінчэньня рэштак фактычнай няроўнасьці, якая вядзе да сацыялізму. Асінбуд — гэта новы скачок наперад, гэта новы довад правільнасьці ўзятых намі тэмпаў у справе гаспадарчага будаўніцтва краіны.

Зусім відавочна, што ўсё ўпартае, «крывавае і бяскроўнае» змаганьне, якое вяла і вядзе наша партыя за будаўніцтва сацыялістычнай Беларусі, што гэтае змаганьне працякала і працякае наперакор усёй нацыяналістычнай контр - рэвалюцыі, наперакор беларускаму нацыянал - дэмакратызму. Асінбуд, зьяўляючыся дзіцянём пралетарскай дыктатуры, зьяўляючыся фундамантам сацыялістычнай індустрыялізацыі нашай краіны, наносіць руйнуючы ўдар па ўсёй беларускай контр - рэвалюцыі, кідае яшчэ адзін яркі сьвят на фашысцкую ролю, якую адыгрывае беларускі нац.-дэмакратызм. Ёсьць два шляхі, якімі можа ісьці Беларусь. Першы шлях, наш шлях, **шлях, якім ідзе БССР** — гэта пралетарская дыктатура на чале з бальшавіцкай партыяй, гэта бязьлітаснае змаганьне супроць капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі, гэта ўпартае і непрымірымае змаганьне супроць усялякіх нацыяналізмаў і шавінізмаў. Другі шлях — гэта шлях абярненьня Савецкай Беларусі, накіпталт Заходняй Беларусі, у калёнію польскага капіталу, у краіну, якая ўцісканецца і эксплёатуецца сваёй і акупацыйнай буржуазіяй, у краіну, якая стогне пад сацыяльным і нацыянальным уціскам фашызму. На другім шляху стаіць уся беларуская контр-рэвалюцыя. На другі шлях яна хацела-б сьцягнуць працоўныя масы БССР.

Ідучы нашым шляхам, шляхам будаўніцтва сацыялістычнай Беларусі, мы маем такія перамогі на фронце гаспадарчага адраджэньня краіны, як Асінбуд. Другі шлях — гэта голад, нэндза, поўны гаспадарчы распад, беспрацоўе, расстрэлы, турмы і дэфэнэзыва, г. зн. уся тая змрочная рэчаіснасьць акупанты, якую перажываюць зараз нашы браты на клясе ў Заходняй Беларусі.

Беларускія нацыянал - дэмакраты імнога расьпіналіся і расьпінаюцца аб тым, што яны зьяўляюцца гістарычнымі «прадстаўнікамі беларускага народу», што яны, і ніхто іншы, закліканы быць «манапалістымі ў справе будаўніцтва беларускай культуры». За гэтай надзвычай празрыстай шырмай ілжывых фраз таілася і тоіцца на працягу ўсяго змаганьня працоўных Беларусі за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне абліча самай подлай, самай здраднецкай, самай прастытуйраванай нацыяналістычнай контр - рэвалюцыі. Усе гэтыя Лёсіні, Искрашэвічы і г. д., якія марылі аб міністэрскіх партфэлях, уздыхалі аб асабнячках і садзіках, ня спынялі змаганьня супроць сацыялістычнага будаўніцтва БССР, супроць беларускай пралетарскай культуры, супроць нашых сацыялістычных Асінбудаў. У той час, як пад кіраўніцтвам КП(б)Б працоўныя БССР, пястрымана ламаючы супраціўленьне клясавага ворага, з кожным новым годам Кастрычніцкай рэвалюцыі робя

АСОАВІЯХІМ—апора мірнае працы і абароны СССР

Дапамагаць Асоавіяхіму ў адказнай рабоце па ўзмацненьні абароназдольнасьці нашай краіны, за актывізацыю членскай масы, за спаборніцтва ў асоавіяхімаўскіх ячэйках

Капіталістычны сьвет знаходзіцца ў ніпцюрох жорсткага эканамічнага крызісу. Рост беспрацоўя, зруйнаваньне працоўнага сялянства, жудасная эксплёатацыя працоўных сялян і паўкапёній, крывавыя расправы з рэвалюцыйным пралетарыятам і рэвалюцыйным сялянствам абвастраюць клясавае змаганьне ў краінах капіталізму, наближаюць пагібель буржуазнага сьвету і шпаркімі крокамі вядуць да пераможнай сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Буржуазія шукае выхаду са створанага становішча шляхам новай імпэрыялістычнай вайны і, у першую чаргу, новага ўзброенага нападу на Савецкі Саюз. «Кожны раз, калі капіталістычныя супярэчнасьці пачынаюць абвастрацца, буржуазія зварачае свае погляды ў бок СССР, ці ня можна вырашыць тую ці іншую супярэчнасьць капіталізму, або ўсе супярэчнасьці разам узятыя, за кошт СССР, гэтай краіны Саветаў, цытадэлі рэвалюцыі, якая рэвалюцыянізуе адным сваім існаваньнем рабочую клясу і калёніі, перашкаджае падзяпіць сьвет нанова, перашкаджае гаспадарыць на сваім вялікім унутраным рынку, які патрэбны капіталістым, асабліва цяпер, у сувязі з эканамічным крызісам» (І. Сталін - на XVI зьезьдзе УсеКП(б)).

Палітыка Савецкага Саюзу—палітыка міру. Для ажыцьцяўленьня пляну індустрыялізацыі краіны, для перабудовы сельскае гаспадаркі на сацыялістычны пад нам патрэбны мір. У барацьбе за сацыялізм пераможа наша зброя — варштаты і машыны, гіганты мэталю, машынабудаўніцтва, электрыфікацыя, хэмія. Наша задача—выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, выкананьне новых і новых пяцігодак да поўнае пабудовы сацыялізму.

Гіганцкія посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў першыя два гады пяцігодкі, вялізарныя дасягненьні ў справе калектывізацыі, ліквідацыя кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, пасьпяховая барацьба з правымі апартуністымі і «левымі» загібшчыкамі зьяўляецца яскравым пацьвярджэньнем правільнасьці генэральнай лініі камуністычнае партыі і яе ЦК, правільнасьці яго кіраўніцтва будаўніцтвам сацыялізму адзінай у сьвеце пралетарскай дзяржавы.

Імпэрыялістыя правакуюць вайну, рыхтуюцца адкрыта да яе. Падзеі на Далёкім Усходзе, стварэньне ваеннага саюзу Польшчы, Румыніі, Латвіі, Чэхаславакіі, Юга-Славіі і інш. для нападу на СССР, абмежаваньне ўвозу савецкіх тавараў ва Францыю і, па яе ўказцы, у Бэльгію, Румынію і інш., скліканьне «аграрных» канфэрэнцый балканскіх дзяржаў, накіраваных, пад кіраўніцтвам Францыі, супроць краіны Саветаў, правакацыйнае парушэньне мяжы ў Фінляндыі,—усё гэта зьвеньні таго панцугу, які называецца—вайна супроць Савецкага Саюзу.

Мы павінны быць на варце.

У адказ на шалёную падрыхтоўку імпэрыялістых да нападу на нас, мы павінны ўдзесяцярыць усе нашы сілы на справу сацыялістычнага будаўніцтва, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, па ўсім фронце. Разам з уздымам прамысловасьці і перабудовы сельскае гаспадаркі, мы павінны ўзмацняць абарону краіны Саветаў.

«Дэкада абароны» гэтага году, у сувязі з вышэйпаказаным, набывае вялізарнае значэньне і атрымлівае новыя задачы, якія перш за ўсё заключаюцца ў тым, што «дэкада абароны» гэтага году праводзіцца пасьля XVI зьезду УсеКП(б), які адзначыў у сваіх гістарычных пастановах шляхі сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце.

Будаўніцтва сацыялізму ў СССР праводзіцца пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі і рукамі дзесяткаў мільёнаў пралетарыяту, камунараў і калгасьнікаў. Гэтымі-ж рукамі павінна будавацца і абарона СССР.

Тэрміны мірнага адпачынку канчаюцца. Набліжаецца гістарычна нямінучая эпоха ваеннага змаганьня з капіталістычным сьветам. Няма ніякага сумненьня, што ў рашучы момант працоўныя БССР, знаходзячыся на мяжы дзьвёх сыстэм (сацыялістычнай і капіталістычнай), разам з працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу праявяць энтузіязм і гатоўнасьць усімі сіламі і сродкамі абараняць сваю пралетарскую дзяржаву.

Але-ж для сучаснай вайны патрэбна тэхніка. Індустрыялізацыя краіны зьяўляецца лепшым дапаможнікам узбраеньня тэхнічнымі сродкамі Чырвонай армі. Апрача тэхнікі, будучая вайна патрабуе мільёнаў падрыхтаваных рэзэрваў. Ні на крок назад ад вызначанай пяцігодкай праграмы пабудовы буйное прамысловасьці. Поўнае выкананьне прамфінпляну, ніводнага прагулу. Трэці год пяцігодкі, разам з далейшым пасьпяховым будаўніцтвам сацыялізму, павінен яшчэ больш узмацніць абароназдольнасьць краіны, павялічыць тэхнічнымі сродкамі ўзбраеньне нашай Чырвонай армії.

Трэці год пяцігодкі павінен даць новыя падрыхтаваныя рэзэрвы для Чырвонай армії. Рады т-ва садзейнасьці абароне і авіяцыйна-хэмічнаму будаўніцтву СССР «Асоавіяхім»—зараз налічваюць 6 мільёнаў членаў па Саюзе. Павялічым да канца пяцігодкі лік членаў нашага т-ва да дваццаці мільёнаў па Саюзе. Дамо ў «дэкаду абароны» новых дзьвесьце тысяч членаў т-ва па БССР.

Таварышы! Ва ўспамін дзесяцігодзьдзя гэраічнага мінулага грамадзянскай вайны, ва ўспамін тых, якія жыцьцём сваім заплацілі за пралетарскую рэвалюцыю, за сьветлую будучыню, да якой шпаркімі тэмпамі вядзе нас камуністычная партыя, дамо слова яшчэ больш напружана будаваць сацыялізм, узмацняць абарону, ахоўваць заваёвы Кастрычніка.

Працоўныя БССР! У «дэкаду абароны» мы заклікаем вас яшчэ шчыльней стаць вакол нашае камуністычнае партыі—вернага кіраўніка і праводыра працоўных на справу сацыялістычнага будаўніцтва, на справу абароны нашае краіны. Мы заклікаем усіх асоавіяхімаўцаў стаць ударнікамі, заклікаем усіх працоўных стаць у рады Асоавіяхіму і разам весьці таксама ўдарна і нясупынна падрыхтоўку да абароны СССР, садзейнасьці нашай Чырвонай армії—вернаму вартаўніку дыктатуры пралетарыяту.

Уступайце ў рады Асоавіяхіму, вядзеце практычную работу праз яго рады!

Няхай жыве камуністычная партыя —верны праводыр працоўных!

Няхай жыве Чырвоная армія—вартаўнік Кастрычніка!

Слава гэроям грамадзянскай вайны!

Няхай жыве Асоавіяхім—апора мірнае працы і абароны СССР!

ЦЭНТРАЛЬНЫ САВЕТ АСОАВІЯХІМУ БССР.

Да ўсіх працоўных, да ўсіх членаў Асоавіяхіму БССР

(З адозвы ЦС Асоавіяхіму БССР)

Працоўная жанчына—актыўны ўдзельнік абароны

Рост ваеннай небясьпекі і пагроза ваеннага нападу на СССР з боку імпэрыялістых з усёй рашучасьцю ставяць перад рабочай клясай і ўсімі працоўнымі нашай краіны задачу ўсямернага ўзмацненьня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу.

Не малаважную ролю ў гэтай справе павінна адыграць працоўная жанчына гораду і вёскі. Мы маем ужо зараз значную колькасьць працоўных жанчын, якія ахоплены ваеннай прапагандай і канкратнай ваеннай падрыхтоўкай. Колькасьць жанчын—членаў добраахвотных т-ваў Асоавіяхіму—з кожным годам значна павялічваецца. Напрыклад, на 1/X—29 г. членаў Асоавіяхіму было 30.879 жанчын, а на 1/X—30 г.—50.509 жанчын. У гуртках вайсковых ведаў, стралковых і інш. гуртках удзельнічаюць 5.798 жанчын. Але-ж гэты рух, у напрамку падрыхтоўкі жанчын да абароны краіны, зусім невыстарчальны. Калі сярод працоўных жанчын гораду яшчэ вядзецца якая-небудзь праца па вянізацыі, дык сярод працоўных сялянак амаль што зусім ніякай працы ў гэтым напрамку не вядзецца.

Практыка грамадзянскай вайны яскрава паказала, якую вялікую ролю жанчына можа адыграць у справе абароны краіны. Жанчына актыўна ўдзельнічала на франтох і асабліва ў тылу, дзе ёй прыходзілася замяняць мужчын, якія пайшлі на фронт.

Зараз, калі за пэрыяд мірнага будаўніцтва, дзякуючы шпаркаму росту нашае прамысловасьці і сельскае гаспадаркі, жанчына ўцягнута ва ўсе галіны сац. будаўніцтва, калі жанчыны набываюць кваліфікацыю токараў, шофэраў, трактарыстых і г. д.—гэта мае вялізарнейшае значэньне для нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Але ня менш важнае значэньне гэта мае і для краіны,—таму работа па падрыхтоўцы гэтых кадраў павінна быць узмоцнена. Працоўная жанчына гораду і вёскі павінна паставіць перад сабой задачу — умець кіраваць машынай як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы і транспарце, каб у любы момант замяніць мужчыну.

У «дэкаду абароны» павінна быць арганізавана самая шырокая прапаганда сярод працоўных жанчын пастаноў XVI партзьезду па пытаньнях абароны краіны. «Дэкада абароны» павінна ўзьняць творчую энэргію і моц рабочае клясы і працоўнага сялянства на выкананьне чарговых задач індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскае гаспадаркі, як асновы замацаваньня абароназдольнасьці СССР.

У «дэкаду абароны» трэба зрабіць рашучы пералом у справе шырокага ахопу працоўных жанчын вайсковай прапагандай і ўсімі відамі і формамі вянізацыі.

Для таго, каб абараніць Савецкі Саюз у выпадку вайны, працоўная жанчына трэба ранейшай добрай навучыцца ўладаць зброяй і вайсковай тэхнікай. Гэта магчыма зрабіць праз арганізацыю Асоавіяхіму. «Дэкада абароны» павінна даць новыя дзесяткі тысяч членаў Асоавіяхіму і ўдзельнікаў гурткоў і курсаў па ваеннай падрыхтоўцы.

Дэлегацкія сходы гораду і вёскі павінны прымаць самы актыўны ўдзел у ажыўленьні работы вячэек Асоавіяхіму, асабліва ў калгасах і вёсцы.

Дэлегацкі сход павінен быць тым зьвяном, пры дапамозе якога неабходна шырока ўцягнуць працоўных жанчын гораду і вёскі ў актыўную работу па іх падрыхтоўцы да абароны краіны. Ніводнай дэлегаткі, якая ня прымала-б удзелу ў тэй ці іншай форме ў справе замацаваньня абароназдольнасьці бацькаўшчыны пралетарыяту ўсяго сьвету.

Л. ЛІБЭНЗОН.

Вучэцеся метка страляць

Работніцы—члены Асоавіяхіму на практычных закятках

Саўгасы і калгасы—апорныя пункты Асоавіяхіму у вёсцы

Капіталістычны сьвет у цяперашні момант знаходзіцца, у сувязі з усё ўзрастаючым эканамічным крызісам і супярэчнасьцямі, у такім тупіку, што выхад з яго—імпэрыялістычная вайна. Але-ж буржуазія імкнецца знайсьці выхад з такога становішча ў падрыхтоўцы нападу на Савецкі Саюз і, за яго кошт, вырашыць усе свае супярэчнасьці.

Наяўнасьць посьпехаў СССР па ажыцьцяўленьні пяцігодкі сацыялістычнага будаўніцтва, па калектывізацыі сельскай гаспадаркі, наяўнасьць рэвалюцыянізаванага ўплыву нашых посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве на калеяніяльныя краіны і міжнародны пралетарыят, павялічваюць вострую нянавісьць нашых ворагаў да краіны Саветаў і паліхіваюць пагрозу нападу на СССР.

Такія ўмовы ставяць перад усімі працоўнымі адказную задачу—яшчэ шырэй разгарнуць сацыялістычнае будаўніцтва, узмацніць абароназдольнасьць краіны Саветаў. Перад Асоавіяхімам, усімі яго арганізацыямі гэтыя ўмовы высоўваюць рад баявых неадкладных задач. Адзіным з іх: узмацненьне вайсковай падрыхтоўкі працоўных, актыўны ўдзел членаў Асоавіяхіму у індустрыялізацыі, хэмізацыі нашае краіны, падрыхтоўка рэзэрваў для Чырвонай армії і работнікаў для сацыялістычнага будаўніцтва. Вырокі ўдзел у перабудове вёскі на сацыялістычны лад—калектывізацыі.

Перад ячэйкай і перад райсаветам стаяць задачы, каб кожны калгас і саўгас адчуваў практычную дапамогу ад арганізацыі Асоавіяхіму. Ячэйка Асоавіяхіму ў калгасе і саўгасе павінна стаць апорным пунктам усёй асоавіяхімаўскай работы на вёсцы, выхаваць усіх членаў ячэйкі ў калгасе і саўгасе ў духу зразуменьня імі палітычных задач партыі і савецкай улады. Раённыя арганізацыі павінны наладзіць шэфскую работу вытворчых гарадзкіх ячэек т-ва над ячэйкамі калгасаў і саўгасаў, бо такія гарадзкія цэнтры, як Віцебск, Гомель і Менск маюць добры актыў і сродкі і маюць магчымасьць дапамагаць сельскім ячэйкам.

Зразумела, што ўся работа Асоавіяхіму павінна будавацца на ўзмацненьні ўзаемадносін Асоавіяхіму з партыйнымі, камсамольскімі і прафесыянальнымі арганізацыямі. Вяз шчыльнай сувязі з імі работу не разгарнеш.

Рабочыя саўгасу і калгасьнікі—гэта тая частка насельніцтва вёскі, якая зьяўляецца галоўнай апорай у рабоце нашага т-ва. Арганізатарам ячэйкі Асоавіяхіму павінны стаць дэмабілізаваны чырвонаармеец—калгасьнік, адпускнікі—рабочыя, студэнты, члены прафсаюзу, якія бываюць у калгасах і дапамагаюць ім у іх рабоце. Яны павінны ня толькі арганізаваць ячэйку, але і зрабіць яе апорным пунктам у рабоце па вянізацыі насельніцтва.

Адной з лепшых форм разгортваньня асоавіяхімаўскай работы зьяўляецца стварэньне навучальна-страявых адзінкамі. Там, дзе ў калгасе, або ў саўгасе ужо ёсьць трактары і аўтамабілі, неабходна арганізаваць гурткі па вывучэньні матора, язды на ўтамабілі і трактары. Гэтым самым ствараецца база для падрыхтоўкі будучых шофэраў, танкістых і кадраў для механізаванай артылерыі.

Вельмі важны вучастак работы ячэйкі Асоавіяхіму—гэта прапаганда мінэральных угнаеньняў і барацьба са шкоднікамі сельскай гаспадаркі. Ячэйка павінна клапаціцца і праводзіць растуумачальную работу па ўжываньні мінэральных угнаеньняў, для чаго трэба закладаць паказальныя вучасткі. Ячэйка Асоавіяхіму павінна арганізаваць атрад ўа барацьбе са шкоднікамі сельскае гаспадаркі, а таксама павінна сачыць, каб калгас ці саўгас не панесьлі страт ад шкоднікаў палёў.

Наветрана-хэмічная абарона і авіяцыйная работа таксама зьяўляюцца адным з важных вучасткаў работы Асоавіяхіму. Раённыя саветы павінны забясьпечыць ячэйкі калгасаў і саўгасаў адпаведнымі дырэктывамі, палажэньнямі і літаратурай па гэтым пытаньні.

Мы маем шмат недахопаў у правядзеньні агітацыйна-прапагандысцкай работы. У плян гэтай работы ячэйкі павінны ўключыць прапаганду ваеннай небясьпекі і барацьбу за мір. Агітпрапработа павінна насіць масавы характар, і таму трэба зьвярнуць на яе асаблівую ўвагу.

Нельга ўсяго пералічыць, трэба кожнай ячэйцы ў «дэкаду абароны» разгарнуць работу, каб яна адчувалася сярод працоўных калгасаў, саўгасаў і ваколічнага насельніцтва.

«Дэкада абароны» павінна зьявіцца стымулам для далейшага разгортваньня і арганізацыі практычнай работы ўсіх членаў і ячэек таварыства на выкананьне пастаўленых перад імі задач на садзейнасьці абароне Савецкага Саюзу.

Пастановы XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б на далейшым разгортваньні індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны—палітычны быць выкананы.

С. ДРЫЛЁНАК.

Дамо пралетарскіх камандзіраў Чырвонай армії

У радзе задач узмацненьня абароназдольнасьці нашай пралетарскай дзяржавы—адно з вялікіх месц займае задача выхаваньня пралетарскіх камандных кадраў для Чырвонай армії.

Як-жа савецкая грамадзкасьць Беларусі адносілася да падбору кадраў Чырвонай армії ў гэтым годзе? Возьмем для гэтага вынікі набору ў Аб'яднаную Беларускую Вайсковую Школу ў гэтым годзе.

Агулам кажучы, якасныя паказальнікі набору гэтага году, у параўнаньні з мінулым, лепшыя. Так, сярод прынятых у школу, у мінулым годзе было рабочых 58 проц., у гэтым годзе—67 проц. Партыйна-камсамольская праслойка у мінулым годзе складала 70 проц., у гэтым годзе—81 проц. Затое па агульнай адукацыі, прынятыя ў гэтым годзе стаяць ніжэй, чым у мінулым годзе. А трэба заўважыць, што задачы вайсковага і палітычнага выхаваньня, пастаўленыя ў праграмах вайсковых школ у гэтым годзе, патрабуюць большага агульна-асьветнага ўзроўню, чым у мінулым годзе.

Трэба, каб савецкія, партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі браліся загадзя за справу вярбоўкі у вайсковыя школы, каб растлумачальная работа аб нашых вайсковых школах была штодзённай работай.

М. Я.

Заняткі дэгазацыйнага атраду авіяхіму

Праваднік вянізацыі працоўных

Разьвіцьцё ваеннай тэхнікі з кожным годам ідзе шпаркімі крокамі. У сувязі з гэтым, зьмяняюцца і тактычныя формы боя, ускладняецца кіраўніцтва апэрацыямі, што ставіць новыя задачы перад начскладам запасу.

Шпаркі рост нашай індустрыі дае шырокія магчымасьці тэхнічнага аснашчэньня нашай Чырвонай армії. Задача начскладу запасу—не адставаць ад ваенна-тэхнічнай мысьлі, ад спосабаў і прыёмаў добрага ўладаньня і кіраваньня ўсімі відамі тэхнічных сродкаў барацьбы. Начскład запасу павінен з усёй сур'ёзнасьцю аднесьціся да павышэньня сваёй вайсковай кваліфікацыі, шляхам актыўнага ўдзелу ў рабоце Асоавіяхіму.

Цэнтральны савет Асоавіяхіму БССР вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы да павышэньня вайсковых ведаў начскладу запасу ня толькі праз курсы, але і праз іншыя віды падрыхтоўкі: завочнай падрыхтоўкі, стварэньня розных гурткоў пры дамах Чырвонай армії і Дамох абароны, скліканьня канфэрэнцый начскладу запасу з пастаноўкай дакладу на ваенна-палітычныя тэмы, палявыя выхады і паездкі з вырашэньнем тактычных задач на мясцовасьці, ваенныя гульні сярод начскладу запасу ў агульных ваенных гульнях. Вызначаны цыкль гутарак прафэсароў ваеннай акадэміі імя Фрунзэ.

Побач з пералічанымі відамі падрыхтоўкі, начскład запасу будзе шырока прыцягнуты для кіраўніцтва ваеннай падрыхтоўкай працоўных, у якой ён будзе адыгрываць выключна важную ролю. Гэта накладае на начскład запасу яшчэ большую адказнасьць.

Да «дэкады абароны» вялікая колькасьць начскладу запасу ўцягнута ў кіраўніцтва ваеннай падрыхтоўкай у тэхнікумах і ў масавых школах, а таксама вучэбна - страявых адзінак, гурткоў вайсковых ведаў, але ўсё гэта яшчэ далёка да ахопу УСЯГО начскладу запасу работай у арганізацыях Асоавіяхіму.

Кожны камандзір, палітработнік запасу павінен прымаць актыўны ўдзел у рабоце Асоавіяхіму. Толькі пры гэтай умове начскład запасу павысіць сваю вайсковую кваліфікацыю і атрымае інструктарска-мэтадычныя навыкі.

РАТОБЫЛЬСКІ.

Павышаем абарону краіны Саветаў

У 1928 годзе Асоавіяхім БССР налічваў 152.175 членаў. На 1 кастрычніка 1930 году колькасьць членаў, аб'яднаных у ячэйкі Асоавіяхіму, ужо ўзрасла да 224.208.

Нават гэтыя некалькі лічбаў зьяўляюцца лепшым довадам вялізарнай зацікаўленасьці шырокіх працоўных мас БССР абаронай савецкай краіны. Буйны рост арганізацый Асоавіяхіму і іх вялікія практычныя дасягненьні — выразны паказальнік росту «АПОРЫ МІРНАЙ ПРАЦЫ І АБАРОНЫ СССР».

Асоавіяхім стаў масавай арганізацыяй будаўнікоў сацыялізму і яго абароны.

Асабліва вялікія дасягненьні Асоавіяхіму БССР за апошні год. Вялікая работа прароблена ў галіне вайсковай падрыхтоўкі працоўных. Даволі адзначыць, што летась налічвалася ўсяго 1.272 гурткоў, а зараз іх ужо ёсьць 3.152.

У 1928 годзе ня было зусім асоавіяхімаўскіх лягераў. Сёлета праз лягеры, паводле вестак з 6 акруг, прапушчана 1.800 чал., сярод якіх 373 жанчыны.

Арганізацыі Асоавіяхіму прымалі актыўны ўдзел у агульных чырвонаармейскіх манэўрах. Сёлета на манэўрах працавала спэцыяльная агітгрупа ЦС Асоавіяхіму, якая мела агітаўтамабіль, кіно-перасоўку, радыё-ўстаноўку, перасовачны цір і літаратуру. Агітгрупа цалкам апраўдала сябе. Яна дабілася вялікіх дасягненьняў у сэнсе папулярызацыі задач Асоавіяхіму, а таксама і задач сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі.

Належная ўвага ў другой палове 1929 году аддаецца працы па сувязі. Так, 659 чал. скончыла тэлеграфна-тэлефонныя курсы. Арганізован гадавальнік службовых сабак, галубіная сувязь.

Моцна разгарнуўся стралковы спорт за апошнія паўтары гады. Лік стралковых гурткоў узрос да 354. У іх навучаецца ўжо 7.119 мужчын і 727 жанчын. На спэцыяльных курсах падрыхтаваны 82 інструктары стралковага спорту. Усебеларускія стралковыя спаборніцтвы выявілі зусім здавальняючае становішча некаторых каманд. Так, віцебская команда ўзяла першы прыз, гомельская—2, менская — 3. Добрую падрыхтаванасьць паказалі жанчыны, асабліва менскія і гомельскія работніцы. На ўсесаюзных стралковых спаборніцтвах нашы мужчынскія каманды занялі 13-е месца (усяго было 45 месц), а жанчыны па дробна-калібэрнай зброі — другое месца. Вынікі для беларускіх каманд трэба лічыць наогул здавальняючымі.

Авіяцыйная і паветрана-хэмічная абарона займаюць значнае месца ў рабоце Асоавіяхіму Беларусі. Вядзецца праца па ўкараненьні процігазаў грамадзянскага тыпу, па ліквідацыі паветрана-хэмічнай неграмотнасьці і падрыхтоўцы каманд паветрана-хэмічнай абароны. Больш-менш здавальняюча ідзе прапаганда авіябудаўніцтва і практычная работа ў гэтай галіне — будоўля мадэлей, плянэрная справа, збор сродкаў на самалёты. Створана 6 авія-мадэльных гурткоў, у якія ўваходзіць 129 мужчын і 14 жанчын — пераважная большасьць піянэры. Сёлета нашы плянэрыстыя прымалі ўдзел ва ўсесаюзных плянэрных спаборніцтвах. Вядзецца падрыхтоўка да абсталяваньня плянэрных станцый.

Вялікая работа праведзена па ўкамплектаваньні школ вайскова-паветраных сіл, якая ідзе выключна праз таварыствы Асоавіяхіму. Трэба прызнаць, што коннай справе аддавалася мала ўвагі. Кавалерыйскіх гурткоў было мала.

Зараз работа коннай сэкцыі пачала ўжо разгортвацца. Намечана ўжо адкрыць у Менску манеж на 15 коняй.

Бязупынна расьце зацікаўленасьць працоўнай жанчыны да ваеннай справы. Новыя тысячы работніц уступаюць у Асоавіяхім, каб дапамагчы абароне краіны. Найбольш энэргічныя работніцы ня толькі самі прымаюць удзел у рабоце Асоавіяхіму, але і заклікаюць да гэтага іншых работніц. Некалькі характэрных лічбаў. У 1928 годзе ў асоавіяхімкамандах налічвалася 317 жанчын, курсамі сувязі было ахоплена 200 жанчын і санітарнымі гурткамі 960. Сёлета мы маем зусім іншы малюнак. Жанчын налічваецца: у вайсковых гуртках больш за 2.000, у стралковых гуртках — каля 750, гурткох хэмабароны — 327, а ў авіяхімкамандах—1.821 (толькі па 6 акругах) і г. д.

Асоавіяхім пасьпеў ужо зарэкамэндаваць сябе ў вёсцы з самага лепшага боку — па лініі вытворчай дапамогі ў змаганьні за больш высокі ўраджай. Асабліва актыўны ўдзел Асоавіяхім прымае ва ўкараненьні хэміі ў сельскую гаспадарку. Арганізацыі Асоавіяхіму вядуць прапаганду за мінэральныя ўгнаеньні і змагаюцца са шкоднікамі сельскай гаспадаркі.

Прапаганда мінэральных угнаеньняў вядзецца шляхам закладкі паказальных вучасткаў. За 1929-30 г. заложана больш за 200 паказальных вучасткаў. Распаўсюджваецца літаратура па пытаньнях хэмізацыі сельскай гаспадаркі.

Змаганьне з с.-г. шкоднікамі пастаўлена на практычныя рэйкі. У 1928-29 годзе Асоавіяхім БССР упершыню выпускае 94 тэхнікаў па змаганьні са шкоднікамі. У тым-жа годзе арганізуецца двухтыднёвік змаганьня са шкоднікамі.

Сёлета Асоавіяхім падрыхтаваў ужо 276 тэхнікаў. Выдана спэцыяльны зборнік па змаганьні са шкоднікамі. Арганізацыямі Асоавіяхіму ў 1930 годзе пратручана больш за 18.000 тон насеньня, ачышчана каля 10.000 тон збожжа, сабрана каля 10.000 тон попелу і г. д. Арганізавана тручэньне сусьлікаў на плошчы 680 гэктараў.

Бясспрэчна, што дасягненьні Асоавіяхіму БССР даволі значныя. Іх, аднак, і ў якім выпадку нельга прызнаць выстарчальнымі. Размах і якасьць работы цэлага раду арганізацый ня могуць задаволіць нас. Асабліва кульгае агітацыйна-прапагандысцкая работа.

Адной з важнейшых задач Асоавіяхіму зьяўляецца ўсебаковая дапамога і садзейнасьць ажыцьцяўленьню пяцігодкі за чатыры гады, асабліва ў галіне авіяцыйнага і хэмічнага будаўніцтва СССР. Наўбходна пераключыць энэргію мільённых мас будаўнікоў сацыялізму ў бок узмацненьня абароны. Гэтага можна дасягнуць толькі сродкамі масавай агітацыі і прапаганды.

Асабліва важнае значэньне зараз набывае работа Асоавіяхіму ў калгасах, саўгасах і машына-трактарных станцыях БССР. Сацыялістычнае перабудаваньне сельскай гаспадаркі на высокай эгратэхнічнай базе ставіць перш за ўсё ва ўвесь рост задачу хэмізацыі і матарызацыі сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Саўгасы, калгасы і МТС ствараюць надзвычай спрыяючую глебу для разьвіцьця масавай работы Асоавіяхіму ў гэтым напрамку.

Саўгасы і калгасы павінны стаць апорнымі апорнымі пунктамі ва ўсёй рабоце Асоавіяхіму ў вёсцы.

А. Сем.

ЛЯГЕР ВІЦЕБСКАЙ АСОАВІЯХІМАЎСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

„Ні адной пядзі чужой зямлі ня хочам. Але і сваёй зямлі ні аднаго вяршка не аддамо нікому". (СТАЛІН).

ПРАЛЕТЛІТАРАТУРУ—на СЛУЖБУ АБАРОНЕ СССР

ЧЫРВОНАЙ АРМІІ—БАЕВУЮ ПЕСЬНЮ, НАРЫС, АПАВЯДАНЬНЕ З ЧАСОЎ ГЭРАІЧНАГА МІНУЛАГА, З БУДОВЫ ВЯЛІЧЭЗНАГА СЁНЬНЯ

ПРАГНІЎШЫ СУСЬВЕТ
ЖЭРЛЫ ВЫСКАЛІЎ ЗНОЎ ТЫМ,
ХТО СТРОЙКАЙ ПАБЕДНАЮ ПОЎНЫ.
КУЮЦЦА НА ЗАХАДЗЕ ТАНКІ, ДРЭДНОУТЫ
І ВІСНУЦЬ ПРАЖЕРНЫЯ ВОЙНЫ.

Задача БелЛАЧАФ'у і БелАПП'у—павесьці сыстэматычную работу па закліку ў літаратуру новых пісьменьніцкіх кадраў з чырвонаармейцаў, у першую чаргу ўдарнікаў-байцоў

ДНІ МІРНАЙ ВУЧОБЫ
Ў ВЯЛІКІМ РАЗГОНЕ
НЯ ЎПРУЦЦА Ў ХАЛОДНЫ ГРАНІТ;
УВАГА І КЛОПАТ—МАГУТНАЙ ЧЫРВОНАЙ,
АХОВЕ САВЕЦКІХ ГРАНІЦ!

МАКСІМ ПУЖАНІН

НА АБАРОНУ!

Нашыя дні —
агні.
Нашыя тыдні —
спрытны.

Вока
за
вока,

Газ
за
газ,

Іпрытам
супроць
іпрыту!

Кіне трыпогу загад,
паставіць вайна пасты:

возьме рабочы газ,
возьме рабочы штык.

З вашых заводаў —
газ,
З вашых заводаў
штык.

Газ гэты —
супроць вас,
штык гэты —
супроць тых —

хто меў пры моры пляж,
з рабочых касьцей палац,

хто абудаваў прыгон —
морачнасьць ясных дзён,

хто на шаснаццаць гадзін
дзень за варштат садзіў,

хто на туромны двор
выгнаў рабочай крыўдзе.

І на сьляды вайны
выйдзем насустрач мы.

Выйдзем і назавём:
першы ангельскі раўком,
першы французкі райком,
першы швэйцарскі камбед,
першы сусьветны савет.

Зброю —
ў плавільны дзіх!
І па сталёвай рацэ,

выплыве ў поле звон
трактараў і барон.

Узыдзе замест гарматаў
сонечнасьць эстакад.

Мы ад варожых рук
пільнуем сваю зару,

Каб на савецкі двор
ня скраўся чужы дазор,

Каб буржуй не палез —
па нафту,
па хлеб,
па лес.
Сьцяг разьвівай чырвоны,
Таварыш!
Мануй абарону!

Праверым вінтоўкі,
аэро-пуцёўкі.

Гудуць маторы,
ходзяць затворы.

Эскадрыльлі
расправілі крыльле.

Сьцяг разьвівае чырвоны,
Таварыш!
Мануй абарону!

Нашыя дні —
агні.
Нашыя тыдні —
спрытны.

Вока
за
вока,

Газ
за
газ,

Іпрытам
супроць
іпрыту!

АБАРОНА КРАІНЫ І ЗАДАЧЫ ЛІТАРАТУРЫ

Сацыялістычнае будаўніцтва штодня прыносіць новыя перамогі. Кожны дзень прыносіць новыя і новыя весткі пра пуск новых фабрык, заводаў, камбінатаў.

Рабочая кляса з посьпехам разгортвае наступленьне сацыялізму на ўсім фронце. Клясавая барацьба набывае найскладанейшыя формы. Клясавы вораг актывізаваўся да нагласьці, ён вынаходзіць новыя розныя спосабы, маскуецца ў рознастайныя колеры, каб весьці падрыўную работу па разбураньні заваяваных крывёю дасягненьняў рабочае кляасы.

Рабочая кляса, апіраючыся на калгасьнікаў, на вясковую беднату, замацоўваючы саюз з серадняком і вядучы яго на шлях сацыялістычнага земляробства, з посьпехам і бязьлітасна перамагае ашалелага непмана, кулака, шкодніка і іх ідэалёгаў.

Клясавы вораг, які вядзе падрыўную работу супроць сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляецца адначасова простым агентам сусьветнага імпэрыялізму. Сацыялістычнае будаўніцтва СССР адбываецца ў капіталістычным акружэньні ва ўмовах актыўнай у розных формах барацьбы імпэрыялізму супроць сацыялістычнай сыстэмы. Нашы посьпехі па набудове сацыялізму не на жарты непакояць капіталістых. Яны добра ведаюць, што значыць для іх перамога сацыялізму ў СССР.

А што адбываецца ўнутры капіталістычных краін? Капіталістычная сыстэма ахоплена нябачаным яшчэ ў гісторыі капіталізму эканамічным крызісам; гэты крызіс у радзе краін ператвараецца ў крызіс палітычны, абвастраюцца і дасягаюць свайго кульмінацыйнага пункту супярэчнасьці усёй капіталістычнай сыстэмы.

Не сакрэт тое, што капіталістычны сьвет, каб выйсьці з бязвыходнага тупіку, каб адтэрмінаваць сваю няміну чую гібель, ужывае досыць актыўныя крокі супроць СССР. Варта спасылацца хоць-бы на ўсім вядомыя факты: лягенда пра «савецкі дэмпінг», якая набыла рэальную форму рэпрэсій супроць савецкага экспарту, па сутнасьці ператвараецца ў эканамічную блёкаду з ясна акрэсьленай тэндэнцыяй ператварэньня яе ў імпэрыялістычную вайну супроць СССР.

Імпэрыялістыя рыхтуюцца да вайны пасапраўднаму, іншымі мэтадамі, чым гэта было раней, ды прытым у непараўнальна большых маштабах. Кожнаму вядома, што першы штурм, першы ўдар імпэрыялістыя нанясуць БССР, як фарпосту Савецкага Саюзу. Таму працоўныя масы БССР павінны быць заўсёды напагатове для абароны, да контр - удару па імпэрыялістычным авангардзе.

XVI зьезд УсеКП(б) у сваіх пастановах а ўсёй ратуючасьцю паказвае на неабходнасьць сканцэнтраваньня ўвагі партыі і яшчэ большай мабілізацыі ўсіх сіл рабочае клясы і бядняцка - серадняцкіх мас сялянства на ўмацаваньне абароназдольнасьці СССР, магутнасьці і баяздольнасьці Чырвонай арміі, морскага і паветранага флёту. Дэкада абароны павінна зьявіцца сапраўдным пачаткам масавага выканаьня гэтай вялізарнай важнасьці дырэктывы.

Калі мы запытаемся: што зрабіла наша беларуская пісьменьніцкая і наогул мастацкая грамадзкасьць, што зрабіў кожны пісьменьнік, мастак паасобку, для выкананьня гэтай важнейшай дырэктывы партыі—дык, на жаль, прыходзіцца даць адмоўны адказ... Наша літаратура, музыка, іншыя віды мастацтва ня толькі не мабілізавалі праа свае спэцыфічныя сродкі працоўных мас для ўмацаваньня абароназдольнасьці СССР, але нават не падышлі шчыльна да гэтых задач, не нерабудаваліся адпаведна вымаганьням, што вынікаюць з капіталістычнага акружэньня.

А між тым, кожнаму знаёмаму з гісторыяй барацьбы рабочае клясы і працоўнага сялянства супроць сваіх ворагаў вядома **вялізарная роля літаратуры, роля мастацтва ў справе перамогі рабочых і працоўных сялян над сваімі ворагамі.** Непатрэбна далёка, у эпохах «Іліяд» і «Адысеяў», шукаць прыклады; варта ўспомніць ролю **Дзян'яна Беднага** ў грамадзянскай вайне, каб на ўсю веліч паўстала тут роля літаратуры.

Ну, а клясавы вораг, як ён адносіўся да мастацкага слова? Клясавыя ворагі рабочых і працоўных сялян заявалі на толькі французкімі і ангельскімі гарматамі і кулямётамі. **Яны заявалі супроць рабочых і сялян і мастацкім словам беларускіх літаратурных карыфэяў. На агіднейшую службу эксплёататарамс тавілі сябе лепшыя таленты беларускай літаратуры.** А гэтыя таленты ці то па сваёй дробна - буржуазнай, нацыянал - дэмакратычнай існасьці, ці то па сваім тлустве (разьбіраць гэта ня час зараз у гэтым артыкуле) аддана служылі герою на «Юр'евым кані» пану Пілсудзкаму, уладару іх «родзнай зямелькі беларускай».

Гэты ўрок мы не павінны забываць (хоць некаторым карыфэям рабочыя і сяляне даравалі іхнюю віну)...

Наша мастацкая літаратура, асабліва яе пралетарскі сэктар, мае значныя дасягненьні ў справе вобразнага паказу барацьбы рабочых і сялян за сацыялістычную рэканструкцыю свайго жыцьця і саміх сябе, у справе актыўнага ўдзелу самой літаратуры ў клясавай барацьбе і сацыялістычным будаўніцтве.

Затое наша літаратура, у тым ліку і пралетарскі яе сэктар, ня можа пахваліцца асаблівымі дасягненьнямі ў справе ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны, у справе стварэньня вайсковага раману, аповесьні, нарысу, паэмы, песьні, частушкі і г. д.

Калі грамадзянская вайна, гэроіка барацьбы рабочых і сялян мімаходам і закранула ў нашай літаратуры, дык Чырвоная армія пэрыяду сацыялістычнага будаўніцтва, мірнай вучобы не знайшла свайго месца ў літаратуры, чакае яшчэ свайго мастака. Наша літаратура моўчкі—нібыта ня бачыць, не адчувае — абыходзіць рэальную небясьпеку вайны, шалёную падрыхтоўку да вайны імпэрыялістых. А гэта сьведчыць аб тым, што **большасьць нашых пісьменьнікаў нават да гэтага часу не ўявіла сабе вялізарнай важнасьці задач узмацненьня абароназдольнасьці СССР, задач па вялізацыі сабе, сваёй творчасьці, сваіх чытачоў.** Калі нашаму пісьменьніку ў ходзе разгортваньня сюжэту свайго твору, ці ў справе падбору вобразу прыходзіцца ўліньвацца ў «вайсковы сьвет», дык часта ён да сьмешнага бездапаможны. Гэта таму, што наш пісьменьнік не вялізаваны, ня ведае ня толькі вайсковай справы, але нават вайсковай лексікі.

У дэкаду абароны наша літаратура павінна ліквідаваць свой «байсковы прарыў», змыць канкрэтнымі творамі ганебную пляму з свайго твару, стаць сапраўднай шматграннай зброяй у руках пралетарыяту.

Дэкада абароны павінна зьявіцца пачаткам сталай сапраўднай, бальшавіцкай вялізацыяй нашай літаратуры, а праз яе і чытача; пачаткам сыстэматычнай і ўпартай работы па зькліку ў літаратуру новых пісьменьніцкіх кадраў з рабочых і сялян чырвонаармейцаў і ў першую чаргу — ударнікаў - байцоў; пачаткам шырокага разгортваньня работы па ўкараненьні мастацкай літаратуры ў чырвонаармейскую масу, а праз усё гэта пачаткам сапраўднай бальшавізацыі нашага пралетарскага літаратурнага руху. Вядома, што ў першых радах гэтай справы павінны быць БелЛАЧАФ і БелАПП.

Кожны пісьменьнік павінен у дэкаду абароны зрабіць рашучы пералом у сваёй творчасьці, для выраішэньня тых задач, што вынікаюць з ролі літаратуры ў клясавай барацьбе, на канкрэтным фронце.

Час, таварышы пісьменьнікі, даць ужо для Чырвонай арміі баявую песьню, нарыс, аповесьць, раман з гэраічнага мінулага, вялічэзнага сёньня.

Задачы абароны краіны, вялізацыі сябе і сваіх спажыўцоў у роўнай ступені адносяцца і да кампазытараў, мастакоў і работнікаў іншых відаў мастацтва.

Літаратура, якая ігнаруе небясьпеку вайны, якая абыходзіць задачы абароназдольнасьці СССР, якая не клапоціцца пра Чырвоную армію—ня можа лічыцца пралетарскай літаратурай, ня гледзячы на іншыя далатныя якасьці яе, бо абарона краіны ёсьць гарантыя пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэраічная Чырвоная армія чакае ня споў, не абяцанак, а рэальнай вайсковай літаратуры!

Л. БЭНДЭ.

ЮРКА ЛЯВОННЫ

МАРШ ЧЫРВОНЫХ ФРАНТАВІКОЎ

Гранітная сьцяною паўстанем
І мужнасьць падвоім сваю,
Калі там, у сьцянах Варшкана,
Нам атручаны штых куюць,
Калі першую ў сьвеце краіну,
Дзе ўецца рубінавы сьцяг,
Імкнуцца варожыя стыні
Крывёй і жалезам працяць.

Паходнае песьні
Сып шрэт, —
Сёньня прадвесьне...
— Рот - фронт!
Сілай, разгонам
Дыхай, вер!
На абарону
Эс-Эс-Эс-Эр.

Мы пойдзем ад весьніц і фабрык
Паводжай на ўсьпенены бруд, —
Мы возьмем іх, тлустых, за жабры
Бязьлітасным мускулам рук!
О, лібе гэносэсэ! Упартасьцю
Будзі змаганьняў насталім, —
Ёсьць толькі адзіная партыя
І правадыр яе—Сталін...

Ударнай брыгадаю
Ў даль руш, —
Над эстакадаю
Грай, туш!
Сонечны час, —
Рот звон, —
Плячо да пляча
— Рот - фронт!

Мы гневу ля прасла ня зьвесім;
Уціск фабрыкантаў—на злом!
Выходзіць рабочы Эсэн
І стукае штэйгер кайлом.
Ня страшны пажары завей нам;
Вірлівыя новыя дні
Ідуць ад спакойнага Рэйна
І з польскіх налючых гранід.

Фанфары наклічуць —
Бой, стык.
У злое аблічча —
Набой, штых!
Старому сьвету
Ня бачыць дня;
Краіну Саветаў
Абараняць!

М. ХВЕДАРОВІЧ

ДОЎГАЧАКАНЫ ГОСЬЦЬ

Вецер гойдае
Мёрзлымі касьцяшкамі саду,
Цёмнаю ноччу
Раджае паэтычны настрой
І прыходзіць гэрой
Баявое мае баляды,
Цёплай блізасьцю
Напаўняючы бедны пакой.

Ён прыходзіць
І зноў да мяне—
Камісар баявой брыгады,
Армейцаў любімец,
Ваяка, харобры асілак;
— Таварыш, Мікола,
Давай памяркуем, парадзім
Вораг насядае
З пераду
Флянгаў
І тылу.

Зараз, таварыш,
Брыгада гатова да бою,
Глянь-жа на плотчу,
Колькі штыхоў ля Рэўкому
Чуеш!
Гарністы вітае
Паходнай трубою
Сэрца армейцаў—
Нашага таварыша
Глаўкома.

Бачыш?
Гарматы на сонцы
Агнём зубаскаляць,
Асядланыя коні.
Дрыжаць на халоднай напоі.

Кулямёты стукочуць
Баіскучаю стукалкай сталі,
І разгорнутым строем
Паходам
Праходзяць шынелі.

Я гатоў, Рафаіл!
Перадай: «Выяжджаю коннымі»
Ды клінка не знайсьці...
...Запрапасьціла чортава сіла...
Пачакай...
Расьлягалі на полі вароны
Прыткасьць сібірачкі
Мае кабылы.

І куды-ж мне,
Ды што...
Ні клінка,
Ні кабылы,
Ні шпораў,
Вінтоўка і сумка
Прыняты заўчора на складзе,
Н'ат і сам я запамятаў
Нумар каторы?
І няма мне каму
Намагчы і парадзіць.

Пачакай, Рафаіл!
Пачакай,
Выяжджаю конна...
...Вецер сіберны,
Паэтычны настрой.
І здалося.
Быць можа спрасоньня,
Толькі што выйшаў
Баявое баляды
Герой.

КАЗАК, САБАЛЕНКА

ЛІСТ-ЗАЯВА

Краіна расьце і расьце,
Творчаю сілай бунтарыць.
Ня вдалее ўзьвяцца, як цень
Над новым [illegible] старасьць...

У тэмпах і рухах штодзень
Напружаны мускулы й нервы.
Нас пераможа ня адзе
Партыя шляхам
[illegible]

Будзем [illegible]
Наперад,
Наперад
[illegible]ерад!
З разгонам - імкнем [illegible]м жыцьці
Для нас
Не зачынены дзьверы.
Вінтоўка, клінок і пяро —
Надзейная зброя паэты...
Пальцы сьцісканць курок,
Вочы ўпіліся ў газэту.
Ударыць ня заўжды з плача
Па ворагу шашкай гатовы.
Уступнем у рады
БелЛАЧАФ
Байцамі мастацкага слова!

ЯНКА БОБРЫК

НАШАЙ ВАРЦЕ

Ўзьвіўся песьня, ветрам ў полі
Над савецкаю зямлёй...
Гэй, таварыш, яшчэ болей
Углядайся ў бок ты свой!

Углядайся пільна ў далі
Пост старажавы!
Да пары да часу сталі
Мы па рубажы.

Ўскінуў раптам вышай голаў
Ды прыслухаўся наўкол,—
Ці ня ідзе якая сволач,
Каб парушыць наш спакой.

Прыпеў.

Бо драпежніцкія зубы
Зехал шчырыць увесь час.
З дня на дзень чакае згубы
Для краіны і для нас.

Прыпеў.

І калі надыйдуць хмары,
Сьвет стары пачне палаць, —
Пойдзем першыя, таварыш,
За саветы паміраць!

Прыпеў.

Не, ня дрогне наша варта:
Моцна, цьвёрда як граніт
І стаіць, каб можа заўтра
Зьмесьці з сьвету сьлед грапіц!

ІП. БАРАШКА

РОТНЫ ПАЭТА

З першых дзён Макар Шляга ў Чырвонай арміі заркамэндаваў сябе, як прыкладны чырвонаармеец. А прачытаны час выявілася, што наш Шляга да таго-ж і самы сапраўдны зірык. Ужо каторы тыдзень рота ў лягерах, а ён ніяк ня можа прыйсьці ў сябе. Усе так прыгожа, хораша, для Макара, навокал. І кучарявы бярозьнік, і прыбраная спорт-пляцоўка, і белыя ільняныя палаткі і жоўты чысты пясок на цэнтэрных лінейках, і рэпятыцыі палкавога аркестру, і палкавыя заняткі,—усё навальнае, уздымае Шлягу. У яго такое мрое вясёлае аганьку, вусны заўсёды шчэпяць галасьцю, а шчокі гараць здаровым маладосьцю.

Падвечар, пасьля заняткаў, Шляга імпрэйвае газэтку,—другую, сядзіцца [illegible]ньку, зробленую ім у парадзе [illegible]ськасьці, лавачку і чытае кніжкі [illegible]отнай бібліятэкі. Аднак, ня [illegible] Макару. Толькі паверне галаву, шурыпіць, шаволіцца, [illegible] жыве, усё красуецца,—вырыва[illegible] у Макара. І доўга глядзіць ён у [illegible] лістыі, покуль суседзі па палатцы [illegible] вынядуць яго з разваг і разгоў[illegible] у самім сабой.

— Хлопцы, гляньце, —наш паэта верш піша,—пачынае адзін з суседзяў.

— На тое ён і ротны лірык,—адазываецца в палатці хлопцы,—на чыну, кожна сказаць, паложана!

Макар злуецца, і для адводу вачэй, [illegible]ецца чуліцам ніжэй, паказвае від, [illegible] кідаць чытаньнем. Ну, а хлопцы, [illegible]разумела, ня спыняюць сваіх жартаў.

— Ты-б лепш з нямі ў валей-бол... Ды-б табе там мячыкам так,—бабух па [illegible]! І нечакана мячык вырываецца з [illegible]ткі і ляціць на Макара.

— Шляга, пачытай верш, і абавязкова прачытай, а ня прачытаеш...

— На губу пашлем!...

— Не на губу, а ў Менск; мы яго там рэдактарам над усімі паэтамі зробім... От, дзе будзе рэдактар!

Але Макар, як це зважае на такія жарты, так нікому ніколі ня чытае сваіх вершаў. Ён проста сароміцца іх. А пісаць—піша. І піша ён тамы, што хочацца пісаць, не пісаць ён ня можа. Самі словы становяцца ў стройныя радкі і калёны, раней чым ён запісвае іх на паперу. Праўда, Макар і ня ведае, ці маюць якую-небудзь вартасьць, яго вершы, вершыкі, прыпеўкі. Нават, напісаўшы верш у насьценгазэту, Макар сваім прозьвішчам не падпісваецца з-за сораму, а доўга выдумвае «псэўдоніо» пад кожны з сваіх вершаў, падпісваючы то «Баен», то «Кулямёт», то «Нока», то проста «Клімаў сын». І як не падпісвае Макар сваіх вершаў, усё адно,—усе ведаюць і гавораць, што Макар Шляга —паэта з шостай зводнай роты.

— А, Шляга? Ты значыць Шляга?—неяк аднойчы спытаў яго камісар палка, калі Макар хадзіў да яго з даручэньнем ад камандзіра роты,—а як-жа, ведаю, ведаю! Паэта ты, кажуць! Вершыкі напісваеш. Пішы, брат, пішы!

Макарка проста і ня ведаў, што і адказаць свайму камісару палка. Ён спачатку матнуў галавой, а потым стаў на «зважай» і адказаў:

— Так, таварышы камісар! Той самы Шляга! Служым трудавому народу!

— Вольна, вольна,—і грузін камісар ня стрымаўся, пачаў усьміхацца, а Шляга пачырванеў.

Вось і сёньня, ходячы дневальным паміж палатак, зорнай летняй ноччу, Макар абдумваў тэмы для новага вершу. Чаму-б не напісаць верш пра дневальнага?

Хадзіў ён доўга—падбіраў рыты, падбіраўся настрою. За ноч быў верш гатовы. А пасьля таго, як прывёз Макар з пазнаваей студні ваду ў вялікай чырвонай бочцы,—ён да падёму сеў на сваю лавачку, выняў з кішэні, зложаны ў чатыры столкі, замаслены спытак і ўпісаў ковы верш, надпісаўшы назву:

ДНЯВАЛЬНЫ

Верш ён напісаў такі:

І ціха ў горадзе палатак,
Плыве спакойна мерны крок,
Дневальны зорна аглядае,
Спакойны летні, ціхі змрок...

Байцы стамлёныя паходам
Сягоньня сьпяць, каб заўтра зноў
Устаць бадзёрымі, як вецер
Суздром вясёлымі ўстаць...

У палатках змрок. Ляжаць статуты.
Вінтоўкі гутаркі вядуць,
І ўспамінаюць, як бывала
Іх несьлі першыя байцы.

Ну, і змагаліся з бандытам!
Эх! Спрытна бралі на прыцэл
Мішэнь жывую капя лесу,
І ніклі цэлі—нібы цень...

Цяпер спакойна! Пасле бою
Умоўна сёньня для байцоў...

І паставіўшы тут цэлы радок кропак Макар працягваў упісваць у сшытак далей строфы з новага вершу.

А ноч насоўвае заслоны
На зорны летні небазвод.
Вакол ціша. А тут вось шолах
Тут, хто? Скажы? З лінейкі арш...
Дневальны мігам уперад крочыць
А перад ім—сасонка маладая.
І ноч плыве. Дневальны кроча.
Спакойна ў лягеры. Ціша.
Глядзіць—на Усходзе нечакана
Ўсплывае досьвітак. Зара.

— Эх, ты зорка, мая зоранька!—любуецца сваім вершам Макар. І піша апошнія радкі:

Гучаць на лягеру сыгналы,
То горніст раніцу сьпявае,
Пад'ем у лягеры ўздымае,
Дневальны варту пакідае,
Бо новы сьветлы дзень настаў.

— Абавязкова,—думае, Макар,—аддам гэты верш у сваю ротную «Ільлічоўку». Верш, як відаць ня з дрэнных. Пісаў з некалі горныя,—і то зьмяшчалі,—а гэты верш, хоць у друк пасылай.

Пасьля аднаго вялікага паходу, дзе за прыкладнасьць шостая сводная была пастаўлена ў галаву калёны, па роце прайшла пракацілася вестка:

— Сам камандзір нашага палка, гэрой трох ордэнаў Чырвонага Сьцягу, будзе дзяліцца свайми ўспамінамі з часоў грамадзянскай вайны.

Рота з цярплівасьцю чакала ўспамінаў старога вэтэрана рэвалюцыі, гэроя грамадзянскай вайны. Хацелася моладзі пачуць словы гэроя. Сотні здагадак, здагадаў, дзесяткі франтоў, імёны чырвоных гэрояў, белых генэралаў,—усё ходырам хадзіла в вуснаў у вусны.

З нейкай асаблівай цярплівасьцю чакаў гэтай гутаркі Макар.

Тут ён нават ня стрымаўся перад свайми таварышамі.

— Пасьля гутаркі я ўжо ня верш, а цэлую паэму разгарну! Толькі ці прымуць яе ў «Ільлічоўку»,—вялікая скажуць,—распісаўся на цэлую газэту!..

Адбой ужо даўным даўно адыграў гарвіст. Суседзі Макаравы моцна сьпяць—стаміліся за начны пераход. Толькі Макар не адчувае стомы. Ён думкамі пераносіцца ў часы грамадзянскай вайны, бачыць свайго камдалка наперадзе Чырвонай конніцы, бачыць, як той першым напісае на варожыя калёны і, разьбіўшы дашчэнту белых, праследуе іх на непраходных лясох, балатох, па стэпу і горах...

...Вось камандзір палка стаіць на высокай гары, у руках трымае чырвоны сьцяг, побач з камандзірам ляжыць забітым яго слаўны конь. Бачыць Макар, як камандзір палка набірае ў грудзі паветра, чуе яго ніякі, ўзьлюнены голас:

— Цяжка было, але мы перамаглі!

І раптам бачыць Макара, як нехта з-за бярозьніку пакіроўвае вінтоўку на яго чырвонага камандзіра.

— Пачакай-жа,—вырываецца ў Макара. Не ўдарма я ўсё заданьні ў баявых практыкаваньнях выканаў. Ён бярэцца за спуск, націскае ахоўнік і кулямёт засакатаў так, што ў вушшу зьвініць.

— Гонар табе, наш слаўны гэрой!—крычыць Макар. Мы перамаглі, мы ў будучыню пераможам!

— Пераможам. Мы пераможам,—чуе Макар галасы з розных бакоў.

— Ура!—крычыць Макар. І... прачынаецца. Ціха ў палатцы. А за палаткай чутны разьмераныя крокі дневальных, ды голас дзяжурнага на палку.

— Дзяжурныя па ротах, на лінейку!...

— ...на лінейку,—чутно водгульле.

Не пасьпеў Макар і ўздрамнуць, як горніст засьпяваў раніцу.

— Шостая зводная, уставай!

З раніцай пачаўся новы працоўны дзень у лягерах. Сёньня пачалі з ўборкі палатак, чысткі аброі. Потым схадзілі ў лазьню, атрымалі чыстую бялізну і мыла. Чырвоныя распацелыя твары чырвонаармейскага маладзяка гараць здароўем.

А падвечар, калі летняе гарачае сонца хавалася за камяніцамі Менску, рота зноў вышла ў палкавы вучэбны паход.

Сонца валацістымі зоркамі гарыць на серабрыстых кончыках шызых новенькіх штыхоў.

Аркестр уперадзе калёны грае баявы паходны марш. Бадзёра ідзе ў страю Макар Шляга—ротны паэта.

Таварыш! Ты мабыць ведаеш, як лёгка ісьці пад гукі гэтага баявога, паходнага маршу. Ногі самі ідуць. Ты не заўважаеш стомленасьці. Галава твая падымаецца вышэй, выпростваюцца плечы, а грудзі ўбіраюць у сябе ўдвая больш паветра, чым пры звычайнай хадзьбе.

Ідзе ў калёне Макар. Поўна думак у яго галаве.

— Эх, каб хутчэй там па Захадзе... Мы-б заўсёды прышлі ў поўнай баявой гатоўнасьці.

Марш бадзёрыць. Стройныя гамы гукаў вядуць за сабой мапалітную калёну байцоў. Толькі час-ад-часу камандзіры разьдзелаў падраўніваюць шэрагі сваёй адрэзістай камандай.

— Ас-два-тры!...

— Ас-два-тры!...

21-X-30 г.

ПАМЯТАЙ:

буржуазія рыхтуецца да вайны

Яна рыхтуе фашысцкія кадры і для нападу на нас, і для змаганьня з прапетарыятам.

Добра запамятайце гэтыя лічбы:

У Польшчы ў 1923 годзе ў фашысцкіх вайсковых арганізацыях было 150.000 чал., у 1927 г.—565.000 ч., у 1930 г.—1.200.000 чал.

У Фінляндыі, Латвіі, Эстоніі: ў 1923 г.—120 тыс. чал., у 1927 г.—175 тыс. чал., у 1930 г.—400 тыс. чал.

Англія, Амэрыка, Японія, Францыя, Італія на падрыхтоўку да вайны ў 1913 г. выдаткавалі 2 мільярды 300 мільёнаў запатых рублёў, у 1930 г. выдаткоўваюць 5 мільярдаў 700 мільёнаў зап. рублёў.

Нашым адказам павінна быць поўная баявая гатоўнасьць, напружаная ваенная вучоба.

У нас--у Саюзе ССР

„Знакамічны ўздым і рост вытворчасьці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Уздым матар'яльнага становішча працоўных, повышэньне заработнай платы рабочых і скарачэньне беспрацоўя.

Адсутнасьць забастовак і рост працоўнага ўздыму рабочых і сялян, які дае нашаму ладу мільёны дадатковых рабочых дзён.

Узмацненьне ўнутранага становішча і згуртаваньне мільённых мас рабочае клясы вакол савецкай улады.

Узмацненьне асноў нацыянальнага брацтва, забясьпечаны кацыянальны мір і згуртаваньне мільённых мас народаў СССР вакол савецкай улады.

Вера ў свае сілы і пэрспэктыва далейшага паляпшэньня становішча" (І. Сталін).

СТАЎКА ІНТЭРВЭНТАЎ БУДЗЕ БІТА

У АДКАЗ НА ШКОДНІЦТВА—НОВАЯ ХВАЛЯ ВЫТВОРЧАГА ЭНТУЗІЯЗМУ НА ФАБРЫКАХ І ЗАВОДАХ БССР

Усе сілы на пасьпяховае будаўніцтва сацыялізму

Агульны сход рабочых швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» ва ўхваленай рэзалюцыі адзначае, што шпаркі рост у галіне разьвіцьця нашай прамысловасьці, нябачны размах тэмпаў калектывізацыі сельскае гаспадаркі, а на базе суцэльнай калектывізацыі—ліквідацыя кулацтва, як клясы, выклікаюць вялізарныя сымпатыі рабочых усяго сьвету да Савецкага Саюзу і нянавісьць буржуазіі. Імпэрыялістыя ўсяго сьвету намагаюць усе сілы, каб сарваць сацыялістычнае будаўніцтва ў першай краіне дыктатуры пралетарыяту.

У адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць шкоднікаў і шпіёнаў з «прамысловай партыі», рабочыя швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» адказваюць: узмоцненым удзелам ва ўдарных брыгадах за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу.

— Агульны сход Менскай абутковай фабрыкі патрабуе ад ураду расстрэлу контр-рэвалюцыянэраў, шкоднікаў.

У адказ на пагрозы імпэрыялістых новай узброенай інтэрвэнцыяй супроць СССР, у адказ на шкодніцтва розных контр-рэвалюцыйных арганізацый, **рабочыя абяцаюць яшчэ з большай настойлівасьцю змагацца за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за выкананьне і перавышэньне заданьняў ударнага кварталу, за разгортваньне сацыялістычнага наступленьня, вядучы рашучую барацьбу з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі.**

Орден Леніна—АДПУ

Агульны сход супрацоўнікаў рэдакцыі і канторы «Зьвязда» патрабуе суровага і бязьлітаснага суда над контр-рэвалюцыянэрамі-шпіёнамі, патрабуе расстрэлу.

Адказ супрацоўнікаў рэдакцыі «Зьвязды» — органу ЦК КП(б)Б — бязьлітаснае змаганьне з уцілямі ад ленінскай партыі. **Двурушнікаў правых і «левых» — вон з партыі!**

Ордэн Леніна, вернаму вартавому завадзёў Кастрычніка — АДПУ!

Няхай жыве Ленінскі ЦК і наш правадыр — т. Сталін!

Тут-жа на мітынгу пачалася дадатковая падпіска на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады». За некалькі хвілін падпіска дала 1.600 руб. Падпіска працягваецца.

Агульны сход выклікае рэдакцыі іншых Менскіх газэт, Белдзяржвыдавецтва, Наркамасьветы і інш. пасьледваць нашаму прыкладу.

Задачы школы ў сувязі з абаронай СССР

Міжнародныя абставіны патрабуюць ад усіх працоўных самае сур'ёзнае ўвагі да пытаньняў абароны СССР. Міма гэтых пытаньняў ня можа прайсьці і наша савецкая політэхнічная школа.

Побач з камуністычным выхаваньнем нашай працоўнай моладзі школа павінна выхаваць актыўных абаронцаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэтай імкліваcьцю павінна быць прасякнута ўся пабудова нашай школы.

У галіне навучальнай кожная дысцыпліна павінна ўключаць у сябе элемэнты клясавага выхаваньня вучняў, як будучых абаронцаў завадзёў Кастрычніка.

Побач з гэтым многія прадметы (фізыка, хэмія, прыродазнаўства і інш.) павінны даць вучням весткі з ваеннай справы, цесна ўвязаныя з пытаньнем, якое праходзіцца, з тым, каб ужо са школьнай лаўкі вучань быў блізкі да пытаньняў абароны і ваеннай тэхнікі. Тады політэхнічная школа адначасова будзе зьяўляцца і ўзмацненьнем нашай абароназдольнасьці.

Па лініі па-зашкольнай работы праз ячэйкі Асоавіяхіму павінны быць **арганізаваны** для 5, 6 і 7 груп **вайсковыя гурткі**, якімі трэба ахапіць асноўную масу вучняў, прыцягваючы для гэтага як начсклад запасу з саміх школьных настаўнікаў, таксама і начсклад РСЧА з бацькоў вучняў.

Мы рэкамандуем гурткі: вайсковыя, стралковыя, паветраныя, хэмічнай абароны, сувязі, пляпэрныя і інш., у залежнасьці ад мясцовых магчымасьцяй. Патрэбна ў існуючыя гурткі ўвесьці ваенныя элемэнты.

На лініі **грамадзка-карыснай** працы школа павінна будаваць сваю выхаваўчую работу ў інтарэсах абароны і прапаганды сучасных задач абароны як сярод саміх школьнікаў, так і сярод акружаючага школу працоўнага насельніцтва.

Тут сувязь з Чырвонай арміяй павінна заняць выдатнае месца ва ўсім вытворчым жыцьці школы.

У «дэкаду абароны» кожная школа, падкрэсьліваючы нашу мірную палітыку, ня гледзячы на правакацыю з боку капіталістых, павінна праверыць і падагуліць, што робіцца ў яе ў справе ваенізацыі. Школы павінны дапамагчы ячэйкам Асоавіяхіму, як у самой школе, так і на вёсцы, асабліва ў калгасах.

Лёзунг — кожны член Асоавіяхіму абавязан у «дэкаду абароны» завербаваць новага члена ячэйкі — павінен знайсьці сярод школьнікаў і настаўнікаў самы шырокі водгук.

Збор сродкаў у «фонд абароны» павінен быць шырока разгорнут у школе.

Вышэйшая школа павінна асабліва зьвярнуць увагу на пастаноўку ваеннай работы як на лініі навучальнай, так і на лініі Асоавіяхіму, улічваючы новую сыстэму ваеннай падрыхтоўкі студэнтаў, калі апошнія сваю ваенную падрыхтоўку праходзяць у сьценах ВНУ і па сканчэньні яго ідуць непасрэдна на вытворчасьць, не адрываючыся на абавязковую службу ў армію.

ПЯТРОЎ.

У іх--капіталістых

„Знакамічны крызіс і заняпад вытворчасьці як у галіне прамысловасьці, так і ў галіне сельскай гаспадаркі.

Пагаршэньне матар'яльнага становішча працоўных, зьнижэньне заработнай платы рабочых і рост беспрацоўя.

Рост забастовак і дэманстрацый, якія вядуць да страт мільёнаў рабочых дзён.

Абвастрэньне ўнутранага становішча і нарастаньне рэвалюцыйнага руху рабочае клясы супроць капіталістычнага рэжыму.

Абвастрэньне нацыянальнага пытаньня і рост нацыянальна-вызваленчага руху ў Індыі і Інда-Кітаі, у Інданэзіі, на Філіпінскіх астравах і г. д., якія пераходзяць у нацыянальную войну.

Замяшальнасьць і пэрспэктыва далейшага пагаршэньня становішча". (І. Сталін).

II пленум ЦКК КП(б)Б

ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ ОРГАНАЎ КК—РСІ

З дакладу тав. Рэвінскага

„Зьезд падкрэсьлівае ўсё значэньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны **для забесьпячэньня эканамічнай самастойнасьці СССР, для ўмацаваньня абароназдольнасьці пралетарскае дзяржавы і адпору ўсякім спробам інтэрвэнцыі** з боку міжнароднага імпэрыялізму".

(З пастаноў XVI зьезду ўсеКП(б).

10-14 лістапада адбыўся II пленум ЦКК, на якім былі разгледжаны наступныя пытаньні: 1) аб унутрыпартыйным становішчы; 2) вынікі другога году пяцігодкі і далейшыя задачы на выкананьні трэцяга году пяцігодкі ў галіне прамысловасьці (дакладчык тав. Іваноў); 3) плян работы ЦКК НК-РСІ на асобны квартал 1930 г. і 1931 г. (дакл. т. Рэвінскі); 4) напярэднія вынікі і далейшы плян чысткі савецкага апарату (дакл. тав. Жолудаў); 5) арганізацыйныя пытаньні.

Тав. **Рэвінскі**, у сваім дакладзе «аб плане работы ЦКК НК-РСІ на асобны квартал 1930 г. і 1931 г.», спыняецца на чарговых задачах кантрольных органаў, якія вынікаюць з пастаноў XVI зьезду ўсеКП(б), XIII зьезду КП(б)Б, дырэктыў партыі і ўраду. Гэтыя задачы ў асноўным заключаюцца ў захаваньні адзінства партыі, забесьпячэньні і правядзеньні генэральнай лініі партыі, бязьлітасным змаганьні з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левымі» загібамі і рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму, прымірэньцтвам да ўхілаў і двурушніцтвам.

У задачы органаў КК РСІ уваходзяць — забесьпячэньне пасьпяховага выкананьня пяцігодкі за чатыры гады і выкананьне плянаў у асобным квартале і апэрацыйным 1931 г.; далейшае пашырэньне і замацаваньне сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы — саўгаснага будаўніцтва і калектывізацыі і, на яе аснове, ліквідацыя кулацтва, як клясы; правядзеньне ленінскай нацыянальнай лініі, але нямецкія пануючыя клясы, якія пры дапамозе сацыял-дэмакратыі адкарміліся на крыві і поце пралетарыяту, распраўляюць свае крылы для імпэрыялістычнай экспансіі.

Капіталістычныя дзяржавы, якія задыхаюцца ў цяжкіх крызісу, які знаходзіць найбольш характэрны выраз у перапытворстве, цяпер стараюцца адна перад другой чым вышэй пабудаваць сьцены мытніц, уводзяць палітыку пратэкцыянізму — усё гэта, каб абараніць свае рынкі перад магутнейшымі канкурэнтамі. З такога становішча ёсьць адзіны толькі выхад — гэта ўзбросны кулак, гэта вайна.

У паветры пахне порахам.

Поруч з абвастрэньнем супярэчнасьцяў паміж капіталістычнымі дзяржавамі, якія ўсё паглыбляюцца, асабліва абвастраецца супярэчнасьць паміж усім капіталістычным сьветам і СССР — краінай, якая будуе сацыялізм. Гэта супярэчнасьць зьяўляецца галоўнай, яна пакрывае ўсе іншыя супярэчнасьці ў сучасны момант.

Усё больш і больш адкрыта капіталістычныя дзяржавы шалёна ідуць СССР, рыхтуючы на яго напад. На чале ўсёй гэтай новай кампаніі стаіць **імпэрыялістычная Францыя**. Запрашаны цэлага раду буржуазных краін (Польшча, Румынія, Юга-Славія, Бэльгія і інш.) па сыгнале з Парыжу пачалі вострую кампанію быццам-бы супроць савецкага «дэмпінгу», г. зн. экспарту па цэнах ніжэй сабекошту, а на справе кампанію байкоту савецкага экспарту. «Дэмпінг» зрабіўся адным з мабілізуючых лёзунгаў буржуазнага сьвету для паскарэньня надрыхтоўкі вайны супроць СССР. Гэта кампанія зьяўляецца змаганьнем з нашай пяцігодкай, яна ставіць мэту яшчэ больш цясьней згуртаваць антысавецкі імпэрыялістычны фронт для задушэньня СССР.

Фашысцкая Польшча ў сваім друку кажа з «шляхетнай» упэўненасьцю, што «таксама, як і ў 1920 г. на ваенным фронце на Вісьле былі набіты бальшавікі, так і цяпер на гэтай-жа самай Вісьле будуць яны набіты і на эканамічным фронце». Пуанкарэ, які зьяўляецца непасрэдным кіраўніком контр-рэвалюцыі і шкодніцтву з «прамысловай партыі», адкрыта гаворыць, што надышоў момант «сумеснага змаганьня з бальшавізмам».

Міжнародная буржуазія добра разумее, што пасьпяховае ажыцьцяўленьне пяцігодкі яшчэ больш узмацняе Савецкі Саюз, яшчэ больш узмацняе сілы міжнародная рэвалюцыі і паслабляе сілы капіталізму. І недарма орган пілсудчыкаў «Ілюстраваны Кур'ер Поданевны» аб так званым «дэмпінгу» піша, што «па меры індустрыялізацыі Расіі... дэмпінг можа прыняць пагражаючыя для нас размеры». Адсюль пілсудчыкі робяць простыя вывады аб необходнасьці найхутчэйшага ўзмацненьня і канчатковай арганізацыі адзінага антысавецкага фронту: «Мы павінны стварыць тэрыторыю сьцісла параўнэньня як гаспадарчага, так і мытнага з Латвіяй, Эстоніяй, Фінляндыяй..., Літвой, а на паўднёвым усходзе — з Румыніяй».

Пад прыкрыцьцём паходу супроць «дэмпінгу» арганізуюцца ўсе сілы контр-рэвалюцыі. Сацыял-дэмакратыя, сацыял і нацыянал-фашысты ідуць упераадзе падрыхтоўкі контр-рэвалюцыйнай антысавецкай вайны і яны асабліва цяпер пачалі праводзіць шалёную кампанію па сьпчале сваіх-жа папоў. «Форвэрц» ва ўсю крычыць, што «дэмпінг—пагроза ўсеагульнаму дабрабыту», тое-ж самае крычаць і польскія сацыял-фашысты з ППС і беларускія, і украінскія нацыянал-фашысты з хэўра Лудкевіча, Астроўскага і іншых.

Роля сацыял-фашыстых і нацыянал-фашыстых у падрыхтоўцы да антысавецкай вайны заключаецца ў тым, каб чым больш і шчыльней скалаціць на толькі антысавецкі замежны фронт — адзіны фронт усіх дзяржаў, але асабліва надаць яму моцнасьці і апоры ўнутры сваіх краін — гэта значыць уцягнуць шырокія працоўныя масы ў вайну, прыстасаваць гэтыя масы на гарматнае мяса супроць СССР.

На гэту тэму ППС кажа: «Добра ўяўляючы сабе справу, ППС ніколі не адмаўляла даць войску Рэчыпаспалітай матар'яльнага і маральнага крэдыту».

Увесь наклёп аб «савецкім дэмпінгу» мае на мэце сеяньне ілюзій сярод працоўных мас капіталістычных краін, каб іх адцягнуць ад непасрэднага змаганьня са сваім унутраным ворагам — буржуазіяй і яе дыктатурай, ад змаганьня за рабоча-сялянскую ўладу, за дыктатуру пралетарыяту. Гэты наклёп **мае на мэце адцягнуць увагу працоўных мас ад таго факту, што яе беспрацоўе, яе галеча, якая ўсё больш паглыбляецца, яе голад і выміраньне зьяўляюцца віной ня ўласных пануючых кляс, а існаваньнем СССР,** бо ён нібы «руйнуе іх дабрабыт».

Побач з усёй гэтай кампаніяй хлусьні і наклёпу супроць СССР усе імпэрыялістычныя дзяржавы і асабліва акружаючыя СССР, як Польшча, Румынія, Прыбальтыцкія дзяржавы, ліхаманкава праводзяць узбраеньні і пераўзбраеньні.

Адным з яскравых паказальнікаў хутчэйшай арганізацыі вайны супроць СССР зьяўляецца факт залучэньня Дзюі, фінансавага кантралёра амэрыканскага і ангельскага імпэрыялізмаў, што ён «узяўся арганізаваць вялікі капітал для фінансаваньня пабудовы польска-румынскай чыгуначнай лініі, якая-б у найкарацейшым кірунку злучала Бальтыцкае мора з Чорным ад Гдыні да Галяцу і Канстанцы, для чаго ён заведаў Румынію». Пад загалоўкам: «Амэрыканскія пляны на Расію», «Польшча і Румынія — апэрацыйная базай» «Газэта Варшаўска» падае, што «прыезд да Бухарэсту пана Дзюі выходзіць з пляну амэрыканскага капіталу..., зацікаўленыя сфэры якога спадзяюцца праз індустрыялізацыю Польшчы і Румыніі заблясьцець сабе апэрацыйную пляцформу для гаспадарчага наступленьня на Савецкую Расію, для забесьпячэньня патрэбнае будучы выраблянь прадукцыю, бо гаспадарча-палітычная структура саветаў усё роўна не дазволіць сябе індустрыялізаваць».

Але, як відаць, роля і місія гэтага прадстаўніка фінансавага капіталу, які нядаўна толькі пакінуў Польшчу, заключаліся ня толькі ў мірным «падпарадкаваньні» СССР, Ён над прыкрыцьцём усяго гэтага скалочваў адзіны антысавецкі фронт. Бо, як піша «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» (пілсудчыкі): «Езьдзячы па прыбальтыцкіх краёх, у Гельсынгфорсе (Фінляндыя) Дзюі заявіў, што «канечным і необходным зьяўляецца зближэньне і супольная праца саюзу Польшчы, Фінляндыі, Літвы, Латвіі, Румыніі, Чэха-Славакі, Венгрыі, Балгарыі і Юга-Славіі». Гэты факт меў свой адбітак і ў Польшчы, паказваючы, як ўвесь фашысцкі лягер Польшчы рыхтуе напад на СССР.

Адна з груповак гэтага лягеру—эндэкі (мянушка польскіх нацыянал-дэмакратаў) — занепакоеная тым, што урад Пілсудзкага на досыць добра, па іх думцы, арганізуе гэты напад, пісала ў сваёй газэце «Дзеньнік Віленскі»: «Ужо ня раз наведвае англельскі флёт румынскі порт у Канстанцы... па поўнач ад Канстанцы знаходзіцца возера Суйтіоль, дзе будзе пабудаваны магутны ваенны ў сучасным стылі порт..., бо ў румынскіх вайсковых колах ужо ня раз выяўлялася боязьнь, што ў выпадку вайны з Расіяй ёсьць небясьпека з Чорнага мора», і далей эндэкі орган пытае ўрад: «штось ня чуваць, каб палітыка Польшчы пакланалася аб дапуску Польшчы да ўдзелу ў гэтай акцыі, якая мае для палай уходняй палітыкі вялізарнае значэньне».

Фашысцкая Польшча, якая, як найслабейшае зьвяно капіталістычнага ланцуга, найбольш востра адчувае гаспадарчы крызіс, які ўсё больш паглыбляецца і пераходзіць ў крызіс палітычны, дае рэвалюцыйны ўздым найбольш расхістае яе фашысцкія падпоры, — яна ў шалестве арганізуе антысавецкую вайну, як адзін выхад з тупіка, адзін сродак задушыць вогнішча сусьветнай рэвалюцыі.

Будуюцца ваенныя аб'екты, мілітарызуецца дзяржаўны і дзяржаўна-гаспадарчы (чыгункі) апарат, а таксама і ўсё гаспадарчае і палітычнае жыцьцё. Праводзіцца ўзмоцненым тэмпам вабесьпячэньне тылу на выпадак вайны. Канцэнтруюцца і сьцягваюцца ўсе сілы як матар'яльныя, так і фізычныя. З мэтай падняцьця баздольнасьці і яшчэ большай канцэнтрацыі дзяржаўнага апарату для расправы і задушэньня рэвалюцыйнага руху ў Польшчы, на Заходняй Украіне і на Заходняй Беларусі, а таксама з мэтай падрыхтоўкі да вайны фашысцкая дыктатура праводзіць выбары. Але і выбары ідуць пад лёзунгам, які яскрава сфармуляваны «Кур'ер Віленскім»:

«Імкненьне Польшчы на ўсход ёсьць гістарычная неабходнасьць. У гэтай неабходнасьці хаваецца культурная (!?) місія».

У гэтых словах пілсудчыкаў з усёй яскравасьцю выяўляецца імкненьне да хутчэйшага нападу на БССР і УССР для падбою і задушэньня гэтых пралетарскіх рэспублік. Гэтыя імкненьні польскага імпэрыялізму стымулююць посьпехі сацыялістычнага наступленьня асабліва ў галіне калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, — апоры польскага імпэрыялізму.

Удзоўж граніцы і ў напрамку да граніцы праведзяцца чыгуначныя лініі. Напрыклад, надрыхтоўваецца да пабудовы стратэгічная чыгунка Беласток — Наваградак—Ашмяны, якая будзе каштаваць 95 млн. злотых, сродкі на якую адпусьціць нібы ангельскі капітал, з якім ведуцца перагаворы. Канчаецца пабудовай стратэгічная чыгунка Друя—Нагост, Друя—Варапаева. Асабліва сьпешныя нарадзкам надрыхтоўваюцца пабудовы шасейных дарог, маючых стратэгічны напрамак і значэньне. У Наваградчыне, далі ў 1929 г. шасейных дарог было 515 клм., а да 1926 г. пабудавана ўсяго 35 клм. і 3.500 мэтраў мастоў, дык ад 1926 да 1930 г. пабудавана 786 клм. новых дарог, а мастоў на 12.000 мэтраў. У Віленшчыне за адны толькі 6 месяцаў пабудавана 100 клм. шашы.

Усе факты палітыкі польскага фашызму — палітыкі вайны паказваюць, як фашысцкая дыктатура зіхаманкава рыхтуецца да вайны і для гэтага падрыхтоўвае свае контр-рэвалюцыйныя сілы. Фашысцкая дыктатура добра ведае, што трэба стварыць моцны тыл, моцную армію, якая-б магла выступіць супроць краіны сацыялізму — СССР. З гэтай мэтай фашыстоўскі лягер прыступіў да вялізнага ўсяго насельніцтва. Ад 1926 да 1930 г. у Польшчы адкамандыраваны ў рэзэрв 3.129 афіцэраў для вядзеньня ваенна-арганізацыйнай работы і ваеннага навучаньня сярод насельніцтва. Па ўсім краі арганізуюцца тэйкі так званага «ЛОПП» (Ліга Обороны Повєтшнай Паньства). Толькі ў адным Наваградзкім ваяводзтве іх налічваецца 154, якія маюць 7.364 членаў. За апошні час узводуж мяжы з СССР арганізаваны ваенныя аэрадромы ля Наваградку, Слоніма, Гародні, Ліды, Вільні. Гета арганізацыя падрыхтоўвае гранаты з газамі ня толькі для ваенных мэтаў, але і для палічы для разгону і задушэньня рэвалюцыйных дэманстрацый.

Наколькі надаецца нялікае значэньне паветранай вайне в СССР, сьведчыць той факт, што фашызм в усіх сіл стараецца чым хутчэй разьвіваць сваю хімічную прамысловасьць, у якой цяпер занята ўжо каля 30.000 рабочых. Бесьперабойна працуюць чатыры фабрыкі самалётаў, і тры фабрыкі самалётных прылад, якія выпускаюць 5 тысяч самалётаў, а таксама 30 тысяч спартыўных самалётаў. Побач з гэтым разьвіваецца і дапамагаючая прамысловасьць. Польшча таксама будуе і ваенную базу на Бальтыцкім моры, каб атакаваць з мора СССР. У апошні час Францыяй прадастаўлены дадзе падводныя лодкі, два мінаносцы і іншыя ваенна-морскія адзінкі для Польшчы.

Польскі фашызм, лічачы важнасьць удзелу жанчын у вайне, **праводзіць ваенную падрыхтоўку сярод жанчын.** Напрыклад, у Гародні арганізаваны 2 курсы і казармы для вяхучэньня «камандантак» (начальніцкі склад) і арганізатараў адцялаў — жанчын.

На ўсёй краіне густой сеткай разгорнуты розныя ваенныя і наўваенныя арганізацыі, як «Стралец» і інш., якія налічвалі ў мінулым годзе каля 800.000 членаў, але цяпер паменьшыліся больш, чым на палову, бо рабоча-сялянскія масы ўсё больш лянюць і пераходзяць у контр-наступленьне на фашысцкую дыктатуру.

Наперакор міжнароднай буржуазіі і яе верным агентам — сацыял-і нацыянал-фашыстым, якія маюць стаўку на новую інтэрвэнцыю супроць СССР і на падтрыманьне ўнутраной контр-рэвалюцыі: кандрацьцеўшчыны, рамзінаўшчыны, стаўку на кулацтва, — пралетарыят і шырокія працоўныя масы СССР пад цьвёрдым ленінскім кіраўніцтвам, у барацьбе з права-апартуністычнымі і «левацкімі» агентамі контр-рэвалюцыі ў партыі рашуча перамагае ўсе труднасьці росту сацыялістычнага будаўніцтва і сьмела пранцыйні крокамі ідзе ўперад, разгортваючы сацыялістычнае наступленьне на ўсіх франтох, ліквідуючы кулацтва, як клясу, гэту апошнюю апору імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Мінула 13 год, як міжнародныя імпэрыялістыя ў саюзе з унутраной контр-рэвалюцыйнай белагвардзейшчынай кінулі ўсе свае магчымыя сілы на задушэньне пралетарскай рэвалюцыі. Але стаўка імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі 1918-20 гадоў была біта ў адкрытым бай гэраічнай Чырвонай арміяй, пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі камуністых бальшавікоў і пры дзейнай дапамозе міжнароднага пралетарыяту, нядаўна слаўная АДУА паказала ўсяму сьвету адвагу салдата арміі міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі.

Толькі некалькі дзён, як мы правялі 13-ю гадавіну Чырвонага Кастрычніка—дзень пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва на ўсіх франтох, дзень агляду перамог другога году пяцігодкі.

«Дэкада абароны» Чырвонай арміі паслужыць новым штурхком да яшчэ большага змаганьня на сацыялістычным фронце, да падняцьця баявой здольнасьці Чырвонай арміі, якая цьвёрда стаіць на граніцах СССР, да ўздыму абароназдольнасьці ўсёй нашай краіны.

Г.

Міжнародны імпэрыялізм рыхтуе новую інтэрвэнцыю на СССР

Капіталістычны сьвет, задыхаючыся ў гаспадарчым крызісе, сыпе і надрыхтоўвае новую інтэрвэнцыю на СССР. Сусьветны крызіс, які ахапіў усе буржуазныя краіны, усё больш абвастрае супярэчнасьці паміж гэтымі капіталістычнымі дзяржавамі.

Яшчэ ня так даўно ўсе сацыял-дэмакратычныя падшпалы імпэрыялізму гудзелі ў адзін голас, што надыходзіць «адраджэньне» пасьляваеннага капіталізму, што ідзе «ўздым на новую ступень прыгожага росквіту». Сёньня ўсе гэтыя падпяваньні абанкрутавалі да канца, у вачох працоўных мас усяго сьвету, у выніку таго сусьветнага гаспадарчага і палітычнага крызісу, які ўсё больш і больш паглыбляецца і які патрасае ў асновах панаваньне імпэрыялістых. Гэты крызіс зьявіўся, як вынік пасьляваеннай «стабілізацыі», якая на справе азначае далейшае расхістваньне і загніваньне капіталізму.

Імпэрыялістыя, якія б'юцца ў цяскох крызісу, як рыба аб лёд, пачалі складаць новыя пляны для новага падзелу сьвету на сферы сваіх уплываў. Па ўсіх швох трактацы Вэрсальскі «мірны» дагавор. Нямеччына, якая выйшла з імпэрыялістычнай вайны набітай, цяпер выступае з патрабаваньнем рэвізіі вэрсальскага дагавору і дабіваецца стварэньня сабе мацнейшай арміі. Польшча, як слуп гэтага дагавору, цяпер занепакоена пытаньнем, узьнятым праз Нямеччыну, аб рэвізіі яе заходніх межаў. Цяпер ужо ня толькі ідзе пытаньне наконт зьмяншэньня ўнутраўскай дані, але нямецкія пануючыя клясы, якія пры дапамозе сацыял-дэмакратыі адкарміліся на крыві і поце пралетарыяту, распраўляюць свае крылы для імпэрыялістычнай экспансіі.

Капіталістычныя дзяржавы, якія задыхаюцца ў цяжкіх крызісу, які знаходзіць найбольш характэрны выраз у перапытворстве, цяпер стараюцца адна перад другой чым вышэй пабудаваць сьцены мытніц, уводзяць палітыку пратэкцыянізму — усё гэта, каб абараніць свае рынкі перад магутнейшымі канкурэнтамі. З такога становішча ёсьць адзіны толькі выхад — гэта ўзбросны кулак, гэта вайна.

У паветры пахне порахам.

Поруч з абвастрэньнем супярэчнасьцяў паміж капіталістычнымі дзяржавамі, якія ўсё паглыбляюцца, асабліва абвастраецца супярэчнасьць паміж усім капіталістычным сьветам і СССР — краінай, якая будуе сацыялізм. Гэта супярэчнасьць зьяўляецца галоўнай, яна пакрывае ўсе іншыя супярэчнасьці ў сучасны момант.

Усё больш і больш адкрыта капіталістычныя дзяржавы шалёна ідуць СССР, рыхтуючы на яго напад. На чале ўсёй гэтай новай кампаніі стаіць **імпэрыялістычная Францыя**. Запрашаны цэлага раду буржуазных краін (Польшча, Румынія, Юга-Славія, Бэльгія і інш.) па сыгнале з Парыжу пачалі вострую кампанію быццам-бы супроць савецкага «дэмпінгу», г. зн. экспарту па цэнах ніжэй сабекошту, а на справе кампанію байкоту савецкага экспарту. «Дэмпінг» зрабіўся адным з мабілізуючых лёзунгаў буржуазнага сьвету для паскарэньня надрыхтоўкі вайны супроць СССР. Гэта кампанія зьяўляецца змаганьнем з нашай пяцігодкай, яна ставіць мэту яшчэ больш цясьней згуртаваць антысавецкі імпэрыялістычны фронт для задушэньня СССР.

Фашысцкая Польшча ў сваім друку кажа з «шляхетнай» упэўненасьцю, што «таксама, як і ў 1920 г. на ваенным фронце на Вісьле былі набіты бальшавікі, так і цяпер на гэтай-жа самай Вісьле будуць яны набіты і на эканамічным фронце». Пуанкарэ, які зьяўляецца непасрэдным кіраўніком контр-рэвалюцыі і шкодніцтву з «прамысловай партыі», адкрыта гаворыць, што надышоў момант «сумеснага змаганьня з бальшавізмам».

Міжнародная буржуазія добра разумее, што пасьпяховае ажыцьцяўленьне пяцігодкі яшчэ больш узмацняе Савецкі Саюз, яшчэ больш узмацняе сілы міжнародная рэвалюцыі і паслабляе сілы капіталізму. І недарма орган пілсудчыкаў «Ілюстраваны Кур'ер Поданевны» аб так званым «дэмпінгу» піша, што «па меры індустрыялізацыі Расіі... дэмпінг можа прыняць пагражаючыя для нас размеры». Адсюль пілсудчыкі робяць простыя вывады аб необходнасьці найхутчэйшага ўзмацненьня і канчатковай арганізацыі адзінага антысавецкага фронту: «Мы павінны стварыць тэрыторыю сьцісла параўнэньня як гаспадарчага, так і мытнага з Латвіяй, Эстоніяй, Фінляндыяй..., Літвой, а на паўднёвым усходзе — з Румыніяй».

Пад прыкрыцьцём паходу супроць «дэмпінгу» арганізуюцца ўсе сілы контр-рэвалюцыі. Сацыял-дэмакратыя, сацыял і нацыянал-фашысты ідуць упераадзе падрыхтоўкі контр-рэвалюцыйнай антысавецкай вайны і яны асабліва цяпер пачалі праводзіць шалёную кампанію па сьпчале сваіх-жа папоў. «Форвэрц» ва ўсю крычыць, што «дэмпінг—пагроза ўсеагульнаму дабрабыту», тое-ж самае крычаць і польскія сацыял-фашысты з ППС і беларускія, і украінскія нацыянал-фашысты з хэўра Лудкевіча, Астроўскага і іншых.

Роля сацыял-фашыстых і нацыянал-фашыстых у падрыхтоўцы да антысавецкай вайны заключаецца ў тым, каб чым больш і шчыльней скалаціць на толькі антысавецкі замежны фронт — адзіны фронт усіх дзяржаў, але асабліва надаць яму моцнасьці і апоры ўнутры сваіх краін — гэта значыць уцягнуць шырокія працоўныя масы ў вайну, прыстасаваць гэтыя масы на гарматнае мяса супроць СССР.

На гэту тэму ППС кажа: «Добра ўяўляючы сабе справу, ППС ніколі не адмаўляла даць войску Рэчыпаспалітай матар'яльнага і маральнага крэдыту».

Увесь наклёп аб «савецкім дэмпінгу» мае на мэце сеяньне ілюзій сярод працоўных мас капіталістычных краін, каб іх адцягнуць ад непасрэднага змаганьня са сваім унутраным ворагам — буржуазіяй і яе дыктатурай, ад змаганьня за рабоча-сялянскую ўладу, за дыктатуру пралетарыяту. Гэты наклёп **мае на мэце адцягнуць увагу працоўных мас ад таго факту, што яе беспрацоўе, яе галеча, якая ўсё больш паглыбляецца, яе голад і выміраньне зьяўляюцца віной ня ўласных пануючых кляс, а існаваньнем СССР,** бо ён нібы «руйнуе іх дабрабыт».

Побач з усёй гэтай кампаніяй хлусьні і наклёпу супроць СССР усе імпэрыялістычныя дзяржавы і асабліва акружаючыя СССР, як Польшча, Румынія, Прыбальтыцкія дзяржавы, ліхаманкава праводзяць узбраеньні і пераўзбраеньні.

Адным з яскравых паказальнікаў хутчэйшай арганізацыі вайны супроць СССР зьяўляецца факт залучэньня Дзюі, фінансавага кантралёра амэрыканскага і ангельскага імпэрыялізмаў, што ён «узяўся арганізаваць вялікі капітал для фінансаваньня пабудовы польска-румынскай чыгуначнай лініі, якая-б у найкарацейшым кірунку злучала Бальтыцкае мора з Чорным ад Гдыні да Галяцу і Канстанцы, для чаго ён заведаў Румынію». Пад загалоўкам: «Амэрыканскія пляны на Расію», «Польшча і Румынія — апэрацыйная базай» «Газэта Варшаўска» падае, што «прыезд да Бухарэсту пана Дзюі выходзіць з пляну амэрыканскага капіталу..., зацікаўленыя сфэры якога спадзяюцца праз індустрыялізацыю Польшчы і Румыніі заблясьцець сабе апэрацыйную пляцформу для гаспадарчага наступленьня на Савецкую Расію, для забесьпячэньня патрэбнае будучы выраблянь прадукцыю, бо гаспадарча-палітычная структура саветаў усё роўна не дазволіць сябе індустрыялізаваць».

Але, як відаць, роля і місія гэтага прадстаўніка фінансавага капіталу, які нядаўна толькі пакінуў Польшчу, заключаліся ня толькі ў мірным «падпарадкаваньні» СССР, Ён над прыкрыцьцём усяго гэтага скалочваў адзіны антысавецкі фронт. Бо, як піша «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» (пілсудчыкі): «Езьдзячы па прыбальтыцкіх краёх, у Гельсынгфорсе (Фінляндыя) Дзюі заявіў, што «канечным і необходным зьяўляецца зближэньне і супольная праца саюзу Польшчы, Фінляндыі, Літвы, Латвіі, Румыніі, Чэха-Славакі, Венгрыі, Балгарыі і Юга-Славіі». Гэты факт меў свой адбітак і ў Польшчы, паказваючы, як ўвесь фашысцкі лягер Польшчы рыхтуе напад на СССР.

Адна з груповак гэтага лягеру—эндэкі (мянушка польскіх нацыянал-дэмакратаў) — занепакоеная тым, што урад Пілсудзкага на досыць добра, па іх думцы, арганізуе гэты напад, пісала ў сваёй газэце «Дзеньнік Віленскі»: «Ужо ня раз наведвае англельскі флёт румынскі порт у Канстанцы... па поўнач ад Канстанцы знаходзіцца возера Суйтіоль, дзе будзе пабудаваны магутны ваенны ў сучасным стылі порт..., бо ў румынскіх вайсковых колах ужо ня раз выяўлялася боязьнь, што ў выпадку вайны з Расіяй ёсьць небясьпека з Чорнага мора», і далей эндэкі орган пытае ўрад: «штось ня чуваць, каб палітыка Польшчы пакланалася аб дапуску Польшчы да ўдзелу ў гэтай акцыі, якая мае для палай уходняй палітыкі вялізарнае значэньне».

Фашысцкая Польшча, якая, як найслабейшае зьвяно капіталістычнага ланцуга, найбольш востра адчувае гаспадарчы крызіс, які ўсё больш паглыбляецца і пераходзіць ў крызіс палітычны, дае рэвалюцыйны ўздым найбольш расхістае яе фашысцкія падпоры, — яна ў шалестве арганізуе антысавецкую вайну, як адзін выхад з тупіка, адзін сродак задушыць вогнішча сусьветнай рэвалюцыі.

Будуюцца ваенныя аб'екты

Выкананьнем прамфінпляну, пасьпяховым правядзеньнем асеньняй с.-г. кампаніі, мабілізацыяй сродкаў насельніцтва--узмоцнім абароназдольнасьць СССР!

Бульба—пралетарскім цэнтрам

180.000—НІ ТОНЫ МЕНІЦ

ДА КАНЦА АДГРУЗКІ—5 ДЗЁН

ЗА ГЭТЫ ТЭРМІН ПОУНАСЬЦЮ ВЫКАНАЕМ НАРАДЫ МАСКВЕ, ЛЕНІНГРАДУ І ДАНБАСУ

Дні ўдарнай, баявой работы

Паляпшэньне рабочага забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў Савецкага Саюзу ёсьць частка барацьбы за выкананьне прамфінпляну і тым самым пяцігодкі за чатыры гады. Пяцігодка за чатыры гады — асноўнае зьвяно індустрыялізацыі нашай краіны і ўзмацненьня яе абароназдольнасьці.

Гэтага ня ўлічылі некаторыя загатоўчыя арганізацыі БССР, якія ганебна зрываюць забесьпячэньне пралетарскіх раёнаў бульбай.

Тэмпы адгрузкі бульбы зьніжаюцца з кожным днём. За 13 лістапада адгружана ўсяго 644 тоны, або 40 вагонаў. ЛСПО адгружана толькі 17 вагонаў, Маскве толькі 3 вагоны, Данбасу — 17 вагонаў, Паўночнаму Каўказу — 1 вагон і ЛВО — 2 вагоны.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб бязьдзейнасьці мясцовых арганізацый, аб парушэньні імі абавязацельстваў перад пралетарскімі цэнтрамі. Замест 700 вагонаў, якія павінны адгружацца кожны дзень, адгружаецца толькі 40 вагонаў. Няма сумненьня, што пры такіх тэмпах плян адгрузкі ні ў якім разе ня будзе выкананы да вызначанага тэрміну (20 лістапада).

Патрэбны рашучыя меры! 5 дзён, якія засталіся да тэрміну, павінны быць днямі ўдарнай, баявой работы.

Калгасы, у першыя рады здатчыкаў!

Пастанова праўленьня калгасцэнтру БССР

У сувязі з невыкананьнем калгаснай сыстэмы плянаў загатовак збожжа і бульбы і неабходнасьцю мабілізаваць усе сілы калгасасыстэмы на ліквідацыю прарыву, Сэсію Савету Белкалгасцэнтру, назначаную на 15 лістапада, адкласьці да поўнага выкананьня калгасасыстэмай плянаў загатовак.

Катэгарычна прапанаваць праўленьням райкалгасаюзу і райкалгасасэкцыям мабілізаваць усіх работнікаў калгасасыстэмы для неадкладнага ўзмацненьня загатовак збожжа і бульбы з тым, каб план адгрузкі бульбы быў выкананы калгасамі не пазьней 20 лістапада, а гадавы плян збожжа-загатовак—не пазьней 25 лістапада.

Камандыраваць на месца для ўзмацненьня загатовак збожжа і бульбы наступных т. т. Міцькова, Агранаўскага, Брытаву, Гарнцарыка, Асмалоўскага, Берга.

„Дазвольце не адгружаць"

Ударыць па дэмабілізацыйных настроях

Весткі з месц паказваюць, што ў радзе раёнаў БССР наглядаюцца дэмабілізацыйныя настроі ў адносінах да адгрузкі бульбы. Замест фарсаванай работы па адгрузцы, некаторыя раённыя работнікі імкнуцца панінуць бульбу на мясцох.

Сіроцінскі, Сеньненскі і Сураскі раёны буртуюць бульбу, ня выконваючы нарадаў на адгрузку. Бялыніцкі райвыканком штурмуе Наркамгандлю і СНК тэлеграмамі, у якіх просіць дазволу на буртаваньне бульбы. Загатоўчыя арганізацыі Жлобінскага раёну амаль зусім бязьдзейнічаюць.

Гэтым дэмабілізацыйным настроям трэба даць рашучы адпор. Тых, хто зрывае важнейшую кампанію адгрузкі бульбы ў пралетарскія цэнтры, трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Да адказнасьці--за зрыў адгрузкі

Рагачэўскі райкаансаюз зрывае адгрузку бульбы ў пралетарскія цэнтры. Ён пераймае фурманкі з бульбай калгасаў і саўгасаў, прызначанай для адгрузкі, і сыпае яе ў свае хавальні.

На катэгарычны пратэст упоўнаважанага ЛСПО старшыня райкаансаюзу Грачоў заявіў:

— «Пакуль не засыпем бульбай нашых хаваленъ, грузіць у яе нікуды ня будзем».

* * *

Паводле вестак, атрыманых рэдакцыяй, старшыня Рогачэўскага райкаансаюзу за зрыў адгрузкі бульбы ў пралетарскія цэнтры прыцягнуты да судовай адказнасьці.

Брагінскі, Камарынскі і Жлобінскі раёны

Забесьпячэньне пралетарскіх цэнтраў

Сакратарыят ЦК КП(б)Б за нядбайныя адносіны да выкананьня заданьня па адгрузцы бульбы прамысловым цэнтрам і за непадачу вестак аб ходзе адгрузкі абвясьціў вымовы сакратаром Брагінскага, Камарынскага і Жлобінскага райкомаў.

За няўважлівыя адносіны да адгрузкі і за непадачу вестак, СНК БССР абвясьціў вымову старшыням райвыканкомаў вышэйназваных раёнаў.

* * *

БРАГІНСКІ раён выканаў толькі 17,5 проц. пляну адгрузкі бульбы. За апошнія тры дні ён не адгрузіў ні аднэй тоны.

ЖЛОБІНСКІ РАЁН адгрузіў 34,4 проц. заданьня. За апошнія тры дні ім нічога не адгружана.

КАМАРЫНСКІ РАЁН выканаў толькі 7,4 проц. заданьня па адгрузцы; за 10, 11 і 12 лістапада ён нічога не адгрузіў.

Гэтыя тры раёны ня выканалі сваіх абавязацельстваў перад пралетарскімі цэнтрамі Саюзу. Кіраўнікі раёнаў павінны быць пакараны.

Плян адгрузкі--да кожнага раёну

Поспех адгрузкі бульбы ў пралетарскія цэнтры залежыць ад дакладнага і своечасовага выкананьня раёнамі сваіх заданьняў. «Белплодагародніна», у выкананьні дырэктыў партыі і ўраду, дала плян адгрузкі бульбы да кожнага раёну паасобку. Кожнаму раёну вызначана поўная колькасьць вагонаў, якую ён павінен адгружаць кожныя суткі да канца адгрузачнай кампаніі.

Раёны павінны мабілізаваць усю сваю энэргію на выкананьне гэтых заданьняў. Вось сутачныя нормы адгрузкі бульбы, вызначаныя «Белплодагароднінай». Копыльскі раён павінен адгружаць кожны дзень 2 вагоны бульбы, Плешчаніцкі—1 вагон, Вузьдзенскі—1, Чэйданаўскі—6, Заспаўскі—6, Лагойскі—3, Бягомльскі—2, Сьмілавіцкі—8, Хадасеніцкі — 1, Барысаўскі — 1, Бярэзінскі — 1, Чэрвеньскі — 5, Пухавіцкі — 9, Грэскі — 1, Смалявіцкі — 3, Полацкі — 3, Расонскі — 6, Ветрыньскі—6, Дрысенскі—2, Асьвейскі—3, Боркавіцкі—4, Вушацкі—2, Лепельскі—6, Вульскі—3, Азарыцкі—4, Жыткавіцкі, —5, Калінкавіцкі—5, Капаткевіцкі—2, Каралінскі—5, Лельчыцкі—2, Пятрыкоўскі—8, Нараўлянскі—8, Тураўскі—8, Юравіцкі—3, Віцебскі—1, Высачанскі—5, Лёзьненскі—6, Сененскі—6, Бешанковіцкі—1½, Чашніцкі—5, Сіроцінскі—6 з пал., Сураскі—2, Аршанскі—3, Багушэўскі—3, Горацкі—10, Дубровенскі—2, Дрыбінскі—8, Кохнаўскі—6, Кругляскі—8½, Ляднянскі—1, Копыскі—3, Крупскі—8½, Мсьціслаўскі—11, Расьнянскі—8, Талочынскі—9, Чэрэйскі—6, Бялыніцкі—10, Быхаўскі—9, Журавіцкі—4, Клімавіцкі—10, Касьцюковіцкі—15, Чырвонапольскі — 3, Крычаўскі—11½, Кармянскі—6, Лупалаўскі—12, Магілёўскі—6, Прапойскі—5, Хоцімскі—1 з пал., Чавускі—9½, Чэрыкаўскі—1 з пал., Чачэвіцкі—7, Шклоўскі—19, Бабруйскі—3, Глускі—12, Рагачоўскі—19, Парыцкі—10, Жлобінскі—24, Клічаўскі—4, Асіпавіцкі—9, Сьвіслацкі—6, Слуцкі—12, Стародарожскі—12, Старобінскі—9½, Любаньскі—12, Чырвонаслабодзкі—6, Брагінскі — 12, Будакашалёўскі—12, Веткаўскі—6, Гомельскі—1½, Камарынскі—8, Лоеўскі—8 з пал., Рэчыцкі—9, Уваравіцкі—11, Хойніцкі—12, Церахаўскі—6, Чачэрскі—5½.

Апошнія дні сплаву

Надзвычайная дэкада дала рэальныя вынікі

Ударная дэкада лесасплаву, праведзеная з 1 па 10 лістапада, дала пэўныя рэальныя вынікі. На працягу гэтай дэкады, скончаны поўнасьцю сплаў па Бабруйскім, Рагачоўскім, Слуцкім, Быхаўскім, Клімавіцкім, Пастаноўскім, Аршанскім, Лельчыцкім, Глускім і Калінкавіцкім лесапрамгасах. Скончылі таксама сплаў Бярэзінскі і Гомельскі пункты Украінлесу, Калінкавіцкі вучастак Заходняй чыгункі і Клінцоўскі «лесгас».

Блізкія да сканчэньня сплаву-Вузьдзенскі, Асіповіцкі і Магілеўскі лесапрамгасы.

Дрэнна ідзе сплаў па Барысаўскім і Гомельскім лесапрамгасах.

Барысаўскі лесапрамгас мае яшчэ ў вадзе каля 160 плытоў у 16.000 куб. мэтраў. Гэтыя лесаматар'яны расьцягнуліся на 47 вёрст уверх па Бярэзіне ад Барысава. Плыты павінны былі прыбыць у Барысаў яшчэ да 5 лістапада. Але з-за асеньняга разводзьдзя і моцных вятроў за апошнія тры тыдні прыгнаць плыты на было магчымасьці. Лесбел ужыў меры для ліквідацыі прарыву. Да сплаву прыцягнуты тры дзяжурныя катэры.

Надзвычайная «чацьвёрка» Барысаўскага РВК пастанавіла прыцягнуць на дапамогу сплаву насельніцтва прыбярэжных вёсак. На кожным плыце пастаўлена замест 2-х чалавек—4. Пры спрыяючым надвор'і плыты прыбудуць у Барысаў праз 5-6 дзён.

Цяжкае становішча са сплавам у Гомельскім раёне. Дзяржпараходства ўвесь час не здавальняе сплаў баржамі. Замест 15 барж, працуе толькі 6. Між тым, трэба перавезьці яшчэ каля 40.000 куб. мэтраў дроў. Ня гледзячы на шматлікія тэлеграмы ўрадавых органаў, Дзяржпараходства ня ўжывае мер для забесьпячэньня сплаву баржамі.

З-за адсутнасьці барж зрываецца работа і ў Мазырскім раёне. 45.000 куб. мэтраў дроў, прызначаных да перавозкі ў Кіеў, ляжаць на месцы. Замест 30 барж, працуе толькі 6.

Трэба ўжыць надзвычайныя меры для сканчэньня сплаву. Дзяржпараходства павінна поўнасьцю задаволіць лесасплаў патрэбнай колькасьцю барж.

Прасунем пазыку у веску

Адной з асноўных умоў пасьпяховага выкананьня пляну ўдарнага кварталу зьяўляецца мабілізацыя сродкаў насельніцтва шляхам рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады».

Разам з разьмяшчэньнем пазыкі ў растэрміноўку ў парадку калектыўнай падпіскі, неабходна ўзмацніць работу па продажы аблігацый за наяўны разьлік, у асаблівасьці ў вёсцы, дзе гэта справа значна кульгае.

Фінансава - крэдытныя ўстановы БССР ужо атрымалі аблігацыі пазыкі «Пяцігодка» для продажу за наяўны разьлік на суму 6 млн. р. Рэалізавана-ж пазыкі за наяўны разьлік толькі на суму 489,8 тыс. руб.

Трэба ў самы кароткі тэрмін шырока разгарнуць работу па арганізацыі продажу аблігацый за наяўны разьлік і зборы усіх запазычанасьці па падпісцы адзінаасобнікаў.

Апрача гэтага трэба сачыць за тым, каб усе сабраныя грошы нідзе не затрымліваліся. Трэба мабілізаваць сельскіх актывістых для абходу ўсіх двароў у мэтах далейшага разьмяшчэньня аблігацый за наяўны разьлік. У адносінах кулацкіх элемэнтаў вёскі трэба ўжываць мэтады грамадзкай узьдзейнасьці. Трэба ня толькі выкарчоўваць рэшткі кулацкіх «агітпропаў», але і мэтадамі грамадзкай узьдзейнасьці прымусіць кулака набыць аблігацыі пазыкі.

ГУРСКІ.

Разгарнуць абмен аблігацый

Пакуль што абменена аблігацый на 12 проц. пляну

Кампанія абмену аблігацый пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі мае вялікае палітычнае значэньне. У вёсцы апэрацыя абмену павінна дапамагчы ўзмацненьню рэалізацыі пазыкі сярод тушчы сялянскага насельніцтва.

Дагэтуль кампанія абмену праходзіла ў нас незадавальняча. Паводле прыблізных падлікаў, трэба было абмяняць аблігацыі ранейшых пазык на аблігацыі пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады» на суму 10 млн. руб. Каб забесьпечыць гэты абмен, крэдытныя ўстановы БССР ужо атрымалі аблігацыі на суму 9.500.000 руб. Абменена-ж аблігацый усяго толькі на 1.200.000 руб., або 12 проц. пляну. Нязначная сума абмену тлумачыцца бязьдзейнасьцю крэдытных устаноў, якія не правялі адпаведнай інфармацыйнай і растлумачальнай работы, не ўцягнулі ў справу абмену камісіі садзейнасьці. Асабліва дрэнна пастаўлен абмен на вёсцы. Там гэтай справай ніхто ня цікавіцца.

Між тым, на тых пазыках, якія падлягаюць абмену, на ўсім СССР ёсьць нявыплачаных выйгрышаў па суму 36 млн. руб. Калі-б была добра наладжана работа з абменам, пазыкатрымальнікі мелі-б значныя сумы.

Для таго, каб правесьці абмен аблігацый, трэба ў першую чаргу паладзіць масавую праверку аблігацый пазык, якія павінны быць абменены. Гэту работу павінны ўзяць на сябе камісіі садзейнасьці дапрыгкрэдыту. У вёсцы трэба таксама стварыць спэцыяльныя брыгады па праверцы з камсамольцаў і вучняў старэйшых трох.

Абмен трэба разгарнуць у бліжэйшыя дні, каб скончыць яго да пачатку сьнежня.

А. Л.

ЗА 100% ПРАМФІНПЛЯНУ

НА ШТУРМ ПРАРЫВАЎ

змагацца—абавязак кожнага ўдарніка

НЕВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАВЫХ ЗАДАНЬНЯЎ ПАСЛАБЛЯЕ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦЬ КРАІНЫ

МАЙСТРЫ...

робяць прастоі

Дрэваапрацоўчы завод «Камінтэрн» у Нова-Барысаве ў кастрычніку выканаў праграму па лесапільнай вытворчасьці на 93 проц., па фанэрнай—на 58 проц. Праўда, фанэрны цэх тыдзень прастаяў з-за адсутнасьці альбуміну. Але, апрача гэтай прычыны, ёсьць шмат іншых. Да гэтага часу не наладжана ўвязка ў рабоце цэхаў, рабочая сіла непэка разьмеркавана, працдысцыпліна пагоршылася, прагулы растуць, а ў канторы нават няма ўліку прагулышчыкаў. Нераспарадчасьць майстроў прыводзіць да прастою. Так, па віне майстра Гурэцкага ў пачатку кастрычніка шэльмашына прастаяла 8 гадзін без работы, па яго-ж віне ўвесь фанэрны цэх прастаяў 4 гадзіны. Упоч з 1 на 2 лістапада такі выпадак паўтарыўся па віне другога адміністратара Навіцкага.

Большая частка рабочых поўна энтузіязму і энэргіі, але адміністрацыя ня ідзе насустрач. Рацыяналізатарскія прапановы, унесеныя пры складаньні сустрэчнага прамфінпляну, да гэтага часу ляжаць без руху.

Х.

КАГО АШУКВАЕЦЕ?

Сябе ашукваеце

ЗВОДКА ВЫКАНАНЬНЯ ПРАГРАМЫ ЗА АПОШНЮЮ ДЭКАДУ КАСТРЫЧНІКА, СКЛАДЗЕНАЯ БУХГАЛЬТЭРЫЯЙ ВІЦЕБСКАЙ АКУЛЯРНАЙ ФАБРЫКІ, ПАКАЗВАЕ, ШТО ФАБРЫКА ВЫКАНАЛА ПРАГРАМУ НА 101,29 ПРОЦ. АЛЕ ГЭТА ЛІЧБА ДАТЫЧЫЦЬ ТОЛЬКІ 4-Х ЦЭХАЎ, ПЯТЫ ЦЭХ — ШЛІФАВАЛЬНЫ — ЧАМУСЬЦІ НЕ ЎВАЙШОЎ У ЗВОДКУ. БУХГАЛЬТЭРЫЯ АБМЕЖАВАЛАСЯ ТОЛЬКІ ЗАУВАГАЙ, ШТО «ШЛІФАВАЛЬНЫ ЦЭХ З-ЗА АДСУТНАСЬЦІ ЭЛЕКТРА-ЭНЭРГІІ НЯ БЫЎ ПОЎНАСЬЦЮ ЗАГРУЖАНЫ І ЗАДАНЬНЯ НЯ ВЫКАНАЎ». ГЭТА ПРАЎДА, АЛЕ ГЭТА НЯ ЗНАЧЫЦЬ, ШТО МОЖНА УВОДЗІЦЬ Ў ЗМАН РАБОЧЫХ ВЫБЫ ФАБРЫКА ПЕРАВЫКОНВАЕ ПРАГРАМУ.

ШТО ДАТЫЧЫЦЬ ШЛІФАВАЛЬНАГА ЦЭХУ, ДЫК ДА ЎРЭГУЛІЎАНЬНЯ ПЫТАНЬНЯ АБ ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ, ТРЭБА РАБОТУ Ў ІМ СПЫНІЦЬ І РАБОЧЫХ СКАРЫСТАЦЬ НА ІНШЫХ ЦЭХАХ. БО ЗАРАЗ ШЛІФАВАЛЬНЫ ЦЭХ САМ НЕ ПРАЦУЕ І ПЕРАШКАДЖАЕ ПРАЦАВАЦЬ ІНШЫМ ЦЭХАМ.

РОЗА ЦВЭЙ.

За савецкае дырыжаблябудаўніцтва

Рабкоры апорнага пункту газэты «Зьвязда» заводу імя Ланцуцкага ў Гомелі ўносіць па 1 руб. на пабудову дырыжабляў імя «Правды» і «Клім Варашылаў» і выклікаюць усіх рабочых і служачых заводу імя Ланцуцкага, а таксама рабочых усіх заводаў Гомельшчыны («Пралетары», «Сельмаш», «Рухавік рэвалюцыі», «Взаўві», «Прада» і інш.).

Рабкоры заводу імя Ланцуцкага выклікаюць рабкораў газэт «Цягнік Сацыялізму», «Палеская Праўда» і інш., а таксама тав. Сяньневіча, тав. Драбышэўскага, дырэкцыю завода — т. т. Хімакова, Яроміна, Шаяна, Кавалёва, Несьцярэнка, майстроў цэхаў — т. т. Пінкіна, Антонава, Побаля, Ануфрыева, Лапіжкага, Батакава, Несьцярэнка, Шляхценка і ўсіх адміністратараў заводу.

Рабкоры зьвяртаюцца да парткому і зьвяркому заводу аб прапрацоўцы і папулярызацыі пытаньня дырыжаблябудаўніцтва на ўсіх рабочых сходах.

Ня цэх, а стайня

АДМІНІСТРАЦЫЯ ФАБРЫКІ «ДНЯПРОЎСКАЯ МАНУФАКТУРА» МАЛА ЦІКАВІЦЦА ПАЛЯПШЭНЬНЕМ УМОЎ ПРАЦЫ Ў ЦЭХАХ. У ВЕЛЬМІ КЕПСКІХ УМОВАХ ПРАЦУЮЦЬ РАБОЧЫЯ ФАРБАВАЛЬНАГА ЦЭХУ. УСЮДЫ БРУД. ЭЛЕКТРЫЧНАГА СЬВЯТЛА НЯМА. ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЯ СКОНЧАНЫ РАМОНТ ЦЭХУ. РАБОЧЫЯ СКАРДЗЯЦЦА НА ХОЛАД, НА НЕМАГЧЫМЫЯ УМОВЫ ПРАЦЫ. АЛЕ НІХТО ПЕ ЗВАРАЧАЕ НА ГЭТА ЎВАГІ.

АХОВА ПРАЦЫ.

Прапановы ў папках

На бабруйскай фабрыцы імя Дзяржынскага рабочым прапановам не здаецца ніякай увагі. На вытворчых нарадах рабочыя прапановы не разглядаюцца і застаюцца ляжаць у папках. За ўвесь год улічана ўсяго 16 прапаноў, у часе распрацоўкі адозвы ЦК УсеКП(б), рабочымі ўнесена звыш 200 прапаноў, але да гэтага часу ня ўсе ляжуць разгледжаны. З прынятых 27 прапаноў, пакуль што праведзены ў жыцьцё толькі 8. Рабочы т. Каган даў некалькі каштоўных прыкладаў. Яны ўжо прыняты і ёсьць пастанова аб прэміраваньні т. Кагана. Справа гэта цяпер ужо 1-5 мес., але прэміі т. Кагану дагэтуль не атрымаў.

Магідаў.

У АДКАЗ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАМ--ШКОДНІКАМ

РАЗГОРНЕМ ДАДАТКОВУЮ ПАДПІСКУ НА ПАЗЫКУ „ПЯЦІГОДКА—ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ"

Выклік камісіі садзейнасьці рэдакцыі газ. „Зьвязда"

Камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту і вышчадсправе пры рэдакцыі і канторы газэты «Зьвязда» абгаварыла пытаньне аб выкрыцьці шкодніцкай контррэвалюцыйнай арганізацыі.

Камісія прызнала, што ЛЕПШЫМ АДКАЗАМ НА СПРОБЫ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ, ШКОДНІЦКАЙ «ПРАМПАРТЫІ» ПАДРЫХТАВАЦЬ ІНТЭРВЭНЦЫЮ І ПАДАРВАЦЬ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦЬ САВЕЦКАГА САЮЗУ,—ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПАШЫРЭНЬНЕ ПАДПІСКІ НА ПАЗЫКУ «ПЯЦІГОДКА ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ», ЯКАЯ ЎЗМАЦНЯЕ ФІНАНСАВУЮ БАЗУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ.

Камісія дадаткова падпісалася на пазыку на 155 руб. — да сумы месячнай зарплаты.

Камісія заклікала ўсіх рабочых і служачых друкарні і супрацоўнікаў рэдакцыі і канторы газэты «Зьвязда», а таксама ўсіх супрацоўнікаў рэдакцый газэт БССР дадаткова падпісацца на пазыку «Пяцігодка за чатыры гады».

Камісія выклікала пасьледаваць яе прыкладу і разгарнуць дадатковую падпіску ўсе камісіі садзейнасьці г. Менску.

Ініцыятыва камісіі садзейнасьці рэдакцыі «Зьвязда» павінна быць шырока падхоплена пралетарскай грамадзкасьцю БССР.

На выступленьні контр-рэвалюцыянэраў і шкоднікаў, на імкненьне клясавага ворага пастаўіць Савецкі Саюз на калені перад капіталізмам, мы адкажам удзесяцяроным работай па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны.

Супрацоўнікі газэты «Зьвязда» ў ліку 20 чал. дадаткова падпісаліся на пазыку ў суме 1.300 руб.

Паведамленьні

СЁНЬНЯ:

— Фрунзаўская райКК КП(б)Б-РСІ, сумесна з РК ЛКСМБ, склікае на 15 лістапада, а 7 г. в. у залі пасяджэньняў РК КП(б)Б зьлёт легкіх кавалерыстых Фрунзаўскага раёну. Яўка ўсіх «Л. К» абавязкова.

— БАН. У 8 з пал. гадз. веч. у памяшк. паргасу (гал. корп., пак. 225), адбудзецца сход асьпірантаў экспаміетых БАН і ВДУ па пытаньні аб арганізацыі заняткаў па матэматыцы.

— ЦСПСБ. У 6 гадз. веч., у памяшк. ЦСПСБ (пак. № 6) адбудзецца нарада добраахвотнікаў, якія працуюць у сэктары вытворчасьці і зарплаты ЦСПСБ.

— Дом письменьніка. У 7 гадз. веч. адбудуцца чарговыя заняткі цэнтральнай літаратурнай рабочай студыі пры БелАПП'е.

ЗАЎТРА:

— Дом Асьветы. У 7 гадз. веч. адбудзецца агульны сход членаў саюзу працасьветы, прысьвечаны «дэкадзе абароны». Пасьля сходу — мастацкая частка. Білеты па ГК і МК.

— Усе выкладчыкі, якія кіруюць заняткамі асьпірантаў ВДУ, ВАН і Камвузу ў семінарах, групах па спэцыяльных дысцыплінах і замежных мовах, павінны 16-XI зьявіцца для рэгістрацыі ў пак. № 36 ВАН ад 12 да 3 гадз. дня. Таксама павінны зьявіцца старастаты ўсіх груп і семінараў, якія яшчэ не зарэгістраваліся.

Асьпірантская камісія і аддзел кадраў ВАН з 16 да 20 лістапада праводзяць перарэгістрацыю ўсіх асьпірантаў ВДУ, ВАН і Камвузу. Перарэгістрацыя будзе праводзіцца з 2 да 4 гадз. дня у пак. № 36 ВАН.

— ЦСПСБ. У 7 гадз. веч., у памяшк. ЦСПСБ, пак. № 4, адбудзецца нарада добраахвотнікаў, якія працуюць у арг-інструкт. сэктары ЦСПСБ. ФЗМК сваячасова апавясьціць добраахвотнікаў аб гэтай нарадзе.

— Мен. політэхнікум. У 6 гадз. веч., у памяшк. політэхнікуму, пак. № 19, адбудзецца сход членаў касы ўзаемадапамогі пры Менскім політэхнікуме. У парадку дня — справаздача і перавыбары бюро касы і рэвіз. камісіі.

— Кастрычніцкі райком КП(б)Б склікае 17 лістапада, у 6 гадз. веч., у памяшк. РК (вул. К. Маркса № 3) нараду арганізатараў сэктараў кадраў і росту партыі пры ячэйках, з парадкам дня: выніхі росту партыі за год—кастрычнік і далейшыя задачы. Адказнасьць за своечасовую і поўную яўку арганізатараў сэктараў ускладаецца на сакратароў парт. ячэек і парткалектываў.

— Кастрычніцкі РК КП(б)Б разам з парт. часткаю ВСНГ склікае на 19 лістапада, у 6 гадз. веч., у памяшк. РК (вул. К. Маркса № 3) нараду цэхавага трыкутніка, з наступным парадкам дня: 1) Даклады з месц аб выкананьні зданьняў ЦК УсеКП(б), аб выкананьні прамфінпляну ў цэху за кастрычнік і аб падрыхтоўцы да сустрэчнага прамфінпляну на 1931 г. (заг. мэханічна-зборачнага і ліцейнага цэху зав. «Энэргія», заг. хромавага і жалаціннага цэху зав. «Бальшавік», заг. загатоўчага цэху абутк. ф-кі, заг. цэху на вырабе ложкаў зав. «Ударнік», заг. упшывальнага цэху шчотачн. ф-кі і заг. бягучага рамонту дэпо. 2) Даклад аб чарговых задачах выкананьня прамфінпляну і мабілізацыі мас у цэху і здзіначальне. На нараду павінны зьявіцца партыйцы і камсамольцы заг. цэхамі, цэх. майстры, сакратары парт. і камсам. цэх. ячэек, старшыні і ўпоўнаважаныя цэх. прафбюро — партыйцы.

— У м. Заслаўлі 26 лістапада, у 11 гадз. раніцы, у памяшк. пардому адбудзецца нарада селькораў, рабкораў, сьценкораў і рэдкалегій насьценгазэт Заслаўскага раёну, з наступным парадкам дня: 1) Выніхі калектывізацыі раёну і далейшыя задачы. 2) Роля рабселькораў у кампаніі перавыбараў саветаў.

— ПК ЦКК КП(б)Б просіць РК і ячэйкі КП(б)Б паведаміць аб месцы знаходжаньня і апошняй рабоце члена партыі Шалухоўскага Івана Фёдаравіча.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

НЯНАВІСЬЦЬ

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
Сёньня, 15 лістапада, ЦС Асовіяхім.
ЗАКРЫТЫ ПАКАЗ „ГОРАД ВЯТРОЎ"
Пачатак а 9 гадз. увеч.

Гукавое кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
1-я ГУКАВАЯ ПРАГРАМА
Вытворчасьці Болдаржкіно
Пачатак сэансаў: 6 гадз., 7 г. 30 м., 9 гадз. і 10 гадз. 30 м.
Каса адчынена штодзённа ад 10 да 2 і ад 4 да 10 з пал. гадз. увеч.
ВОГНЕННЫ РЭЙС
прыгодніцкі фільм у 6 частках
Звыш праг. кіно-хроніка Саюзкіно № 5
Пачатак сэансаў дзённых: а 1 гадз. 1-2 гадз. 30 м.
Увечары: 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.
Каса адчынена з 12 гадз.

Кіно-тэатр „Культура"
МЁРТВАЯ ДУША
Новы фільм у 6 частках
Пачатак сэансу: 6 гадз., 7 г. 30 м., 9 гадз. і 10 гадз. 30 м.
Каса адчынена з 4 гадз. 30 м.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
2 фільмы ў адзін сэанс
МАРАК у 5 частках у галоўнай ролі ГАРОЛЬД ЛЕЙД
МАРАЛЬ у 6 частках. У галоўнай ролі ЭЛЕН РЫХТЭР
Пачатак сэансу а 7 гадз.
Каса адчынена з 5 гадз.

КІНО „Пралетары"
Канец Санкт-Пецярбурга
у 7 частках
Пачатак 1 сэансу у 1 гадз. 2-га—у 2-г. 30 м.
Каса адчынена з 12 гадз.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
Замежны баявік у 2-х сэрыях
НІБЭЛУНГІ трагедыя у 12 частках
Дэманструецца 1-ая сэрыя.
Пачатак сэансаў: 1 с.—8 г. 2 с.—8 г. 30 м., 3 с.—11 г.
КАСА—з 5 г.

КІНО „СпартаК"

Дом Асьветы.
20 лістапада пачынаюць працаваць гурткі: політкурсы па дзевяньсот, па політэканоміі, па гістмату, па рэвал. руху, бягучай політыцы, політшкола для малапісьменных, політкурсы для дашкольніц, два вайсковыя гурткі, гурток беларускай мовы, гурток нямецкай мовы, шахм.-шаш. гурток, фізкульт. гурток, музычныя аркестры—духавы і струнны.
Дом Асьветы запрашае ўсіх асьветнікаў запісацца ў гурткі і курсы да 18 лістапада ўключна.
Запіс у канц. дому з 6 да 9 гадз. веч.

„ЗАПЖЕЛДОРСТРОЮ"
ПАТРАБУЮЦЦА:
ЭЛЕКТРАМЭХАНІКІ (нагляднікі),
якія маюць добрую тэарэтычную падрыхтоўку і практычны стаж па пабудове тэлеграфных ліній, тэлеграфных і тэлефонных станцый і якія ведаюць мантаж электравасьвятляльных установак;
старшыя тэлеграфныя рабочыя,
якія ведаюць работы па пабудове тэлеграфных ліній, установуцы і абслугоўваньні тэлефонных апаратаў, вопытныя ў кіраўніцтве рабочымі арцелямі па пабудове ліній сувязі;
тэлеграфістыя-марзістыя,
якія маюць вопыт работы на транспарце.
Заявы аб прыёме на службу з дакумэнтамі або копіямі працоўнага сьпісу адасраваць: Магілеў, БССР, вул. К. Маркса, 6.
Кіраўніцтва „Запжелдорстроя".

Кошт публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 50 к.

ЦП саюзу саўгандальслужачых
паведамляе, што 15 лістапада а 7 гадз. увеч. у залі пасяджэньняў клюбу СГС склікаецца
нарада прафактыву
саюзу СГС г. Менску (старшыні МК і ГК, грамадзкія інструктары, брыгадзіры на праверцы калдагаваро ў і ўнось остатні прафактыў).
У ПАРАДКУ ДНЯ: 1) Даклад аб перазаключэньні новых калдагаваро ў (дакл. старш. ЦП т. Плятнёў). 2) Даклады МК Дзяржкляну, БКС, ашчадкасы, ГК, ЦРК № 1 і 2 аб падрыхтоўцы да заключэньня новых калдагаваро ў.
Яўка прафактыву абавязкова. Запрашаюцца ўсе члены саюзу.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ
у Магілеўскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум на зімовы набор
З 15 лістапада на 15 сьнежня 1930 г. пачынаецца прыём заяў. Да заяў трэба дадаць дакумэнты, згодна даведніка НКА.
Пры тэхнікуме існуюць наступныя архітэктурныя аддзяленьні:
сельска-гаспадарчае, фабрычна-заводзкае і грамадзка-жыльлёвае
У тэхнікум прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 7 груп сямігодкі. Усяго будзе прынята 110 асоб, з іх 70 проц. рабоўных і іх дзяцей, 15 проц. калгаснікоў і сялян, 15 проц. дзяцей спэцыялістых і служачых. Узрост паступаючых з 16 да 25 г. Для рабочых узрост павышаны да 30 г.
65 проц. тэхнікум забесьпечвае стыпэндыяй і інтэрнатам.
Заняткі пачнуцца з 1-га студзеня 1931 г.
Заявы накіроўваюцца па адрасе: МАГІЛЁЎ, БЕЛ., ПЕРШАМАЙСКАЯ № 54, БУДАЎНІЧАМУ ТЭХНІКУМУ.
Дырэктар Тэхнікуму Ліпскі

Да ведама ўсіх дэлегатаў зьезду прафсаюзу лесдрэўрабочых
1-ы (9) Усебеларускі зьезд прафсаюзу рабочых лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці адкрываецца
ў Менску 18 лістапада ў 6 г. веч.
Рэгістрацыя дэлегатаў адбываецца ў памяшканьні ЦП саюзу (Дом Працы, пакой 9, 3 паверх), пачынаючы з 9 гадзін раніцы 18 XI г.

ЛЯЧЭБНІЦА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА КАМІТЭТУ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў
АДКРЫТА ад 9 г. ран. да 9 г. увеч.
Прыём хворых на ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцких, нервовых.
ЭЛЕКТРА-СЬВЕТА-ЛЯЧЭНЬНЕ І КВАРЦ адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
РЭНТГЕН (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 9 г. да 8 г. увеч.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзённа
КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПРАФЭСАРОЎ па ўсіх спэцыяльнасьцях па попярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс с 9 г. раніцы да 9 г. увеч.
Прыём хворых па лекавых кніжках на мітэту. Для усіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВ